WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 ЛЮТАГА 2012 г.
СЕРАДА
№ 30
(27145)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

У ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНЫХ ПАЗІЦЫЯХ БЕЛАРУСІ АДБЫЛІСЯ СУР'ЁЗНЫЯ ЗМЕНЫ

У знешнеэканамічных і знешнепалітычных пазіцыях Беларусі адбыліся сур'ёзныя змяненні, што патрабуе ад органаў дзяржбяспекі аператыўна рэагаваць на сучасныя выклікі і пагрозы. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 14 лютага на пасяджэнні калегіі КДБ па выніках работы органаў дзяржбяспекі ў 2011-м і задачах на 2012 год, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Вы ведаеце, што мы сталі членамі Адзінай эканамічнай прасторы, і, напэўна, ведаеце ўсе недахопы і тое станоўчае, што адбылося ў сувязі з гэтым, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы — члены АДКБ. І там, у гэтым ваенна-палітычным блоку, не без настойлівага ўплыву Беларусі адбываюцца вельмі сур'ёзныя змяненні. Пэўная дынаміка, не новая для чэкістаў, для кіраўніцтва краіны, у нас адбываецца ў адносінах з Захадам, ЗША, іншымі дзяржавамі. Гэта не можа не ўплываць на сітуацыю ўнутры нашай краіны, і гэта не можа не ўваходзіць у кампетэнцыю галоўнай спецслужбы нашай дзяржавы», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што цяперашняя калегія — гэта не параднае мерапрыемства: «Галоўнае для мяне сёння заключаецца ў тым, што я хацеў бы паслухаць вас. Хачу разабрацца, чым жыве галоўная спецслужба краіны».

Перад пасяджэннем калегіі кіраўніцтва Камітэта дзяржбяспекі далажыла Прэзідэнту аб рабоце разведкі і контрразведкі. Затым кіраўнік дзяржавы прыняў удзел у пасяджэнні пашыранай калегіі КДБ, дзе таксама прысутнічалі кіраўнікі іншых ведамстваў сілавога блока. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў падрабязна абмеркаваць тыя агульныя пытанні, якія Камітэт дзяржбяспекі вырашае на сучасным этапе.

У ходзе пасяджэння была дадзена прынцыповая ацэнка дзейнасці КДБ, абазначаны напрамкі далейшага ўдасканалення і канкрэтызаваны шляхі павышэння эфектыўнасці работы ведамства.

СТРЭЧАНСКІ КАРАГОД

ЗДАЎНА бытуе народнае стрэчанскае выслоўе: калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы. Якраз сёння можна паназіраць за надвор'ем, пераканацца, ці будзе са стрэх капеж і ці спраўдзіцца, нарэшце, старажытнае павер'е.

А ў вёсцы Новае Палессе Лельчыцкага раёна пра Грамніцы дзень кажуць на свой лад: калі ў гэты дзень са страхі накапае ды певень нап'ецца, то зіма яшчэ ўвапрэцца! Гэта азначае, што вясна яшчэ няблізка.

Менавіта ў Новым Палессі захаваўся звычай вадзіць стрэчанскі карагод. У гэтай абрадавай дзеі (на фотаздымку) цесна спляліся паганскія і хрысціянскія сімвалы — карагод і асвячоныя ў царкве свечкі. Па-сутнасці, гэта не што іншае, як першая спроба гукання вясны. Нездарма кажуць: Грамніцы — палова зіміцы. Альбо: на Грамніцы зіма з летам сустракаюцца. Стрэчанскі карагод у Новым Палессі сімвалізуе праводзіны зімы за вёску і запрашэнне да сябе вясны. Тут спяваюць:

«Блаславі, Божа,
Зіму замыкаці,
Вясну заклікаці!
На летнія дзянькі,
На цёплыя дажджы!
Усім на здароўечка!..»

— Гэты звычай мы перанялі ад сваіх матуль і бабуль, — кажа мастацкі кіраўнік Дома культуры Надзея Кужалевіч. — Працягваем, бо шчыра верым у Боскую моц грамнічных свечак.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ПРАКАВЕТНАЕ

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

БЕЛАРУСЬ ЗДЫМАЕ ЎСЕ АБМЕЖАВАННІ НА ВЫВАЗ СПАЖЫВЕЦКІХ ТАВАРАЎ

Беларусь здымае з 15 лютага 2012 года ўсе абмежаванні і забароны на вываз фізічнымі асобамі спажывецкіх тавараў за мяжу. Аб гэтым заявіў журналістам начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю ДМК Беларусі Уладзімір Арлоўскі.

Уладзімір Арлоўскі паведаміў, што пастанова Савета Міністраў ад 6 лютага 2012 года № 124 прызнае страціўшай сілу пастанову ад 11 чэрвеня 2011 года № 755. Гэтай пастановай быў зацверджаны пералік тавараў і нормы іх вывазу фізічнымі асобамі, пры перавышэнні якіх падлягаў выплаце спецыяльны збор. Усе гэтыя абмежаванні і забароны з 00.00 15 лютага 2012 года здымаюцца. Што датычыцца вывазу аўтамабільнага паліва за межы рэспублікі, то на яго абмежаванні застаюцца, падкрэсліў начальнік упраўлення ДМК. Кантроль за вывазам паліва ўстаноўлены пастановай Саўміна № 753, якая была прынята ў чэрвені 2011 года.

ВЫБУХ У ГАРАЖНЫМ КААПЕРАТЫВЕ

Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, а 8-й гадзіне вечара выпадковы сведка паведаміў пра выбух і пажар у службу выратавання. Да месца інцыдэнту накіравалі адразу тры брыгады «хуткай», восем адзінак пажарнай тэхнікі, аўтакраны і іншую тэхніку камунальных прадпрыемстваў.

У выніку выбуху пацярпелі (атрымалі апёкі і траўмы) тры мужчыны — усе жыхары Оршы, якія праводзілі рамонт аўто. Адзін гараж быў разбураны, тры — пашкоджаны, знішчаны два аўто, пашкоджаны чатыры...

Быў створаны штаб на чале са старшынёй аршанскага гарвыканкама. Прычына выбуху і велічыня страт устанаўліваюцца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАРАДЗІЛА ФІКТЫЎНА, АТРЫМАЛА НАЯЎНА

Па фіктыўнай даведцы, якую 34-гадовая жыхарка Светлагорска падала ў аддзел ЗАГС Светлагорскага райвыканкама ў 2009 годзе, ёю ў Магілёўскай радзільні быццам былі народжаны дочкі-двайняткі.

Як расказаў начальнік Светлагорскага раённага аддзела следчага камітэта Аляксандр Прыкалоцін, гэта стала падставай для атрымання грамадзянкай дапамогі ў агульнай суме каля Br30 млн. Сёлета жанчына зноў звярнулася ў той жа аддзел ЗАГС з даведкай аб нараджэнні яшчэ і сына, але на гэты раз супрацоўнікі ўсумніліся ў сапраўднасці паперы. Калі сталі правяраць, высветлілася, што дзяцей насамрэч няма. Грамадзянка расказала, што дакументы яна купіла ў знаёмай за 100$. Непрацуючая ашуканка затрымана. За махлярства ў асабліва буйным памеры яна можа быць пакарана пазбаўленнем волі на тэрмін да 7 гадоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

С 15 февраля 2012 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 07.02.2012 №35 размер ставки рефинансирования установлен в размере 43,0 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 2 процентных пункта с 15 марта 2012 года.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, MTC) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

«Прамая лінія»

УСЁ ПРА ЛЬГОТНЫЯ КРЭДЫТЫ ДЛЯ ЖЫЛЛЁВЫХ ЧАРГАВІКОЎ

6 студзеня сёлета кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Указ № 13, які ўдакладняе падыходы да льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва. На якіх умовах, хто і ў якіх аб'ёмах цяпер можа разлічваць на атрыманне такіх ільготных крэдытаў?

СЁННЯ з 11.00 да 12.30 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **дырэктара дэпартамента крэдытавання насельніцтва Беларусбанка Віктарам Аляксандравічам АГЕЕВЫМ**.

Нумары «прамой лініі»:
8 (017) 292 38 92,
8 (017) 292 38 21.

ЖЫЛЛЁВЫ М²: БОЛЬШ РАЗЛІЧВАЦЬ НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ

ТОЛЬКІ палова чаргавікоў цяпер можа разлічваць на дзяржпадтрымку пры будаўніцтве жылля. Пра гэта ўчора паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН.
Было адзначана, што па стане на пачатак 2012 года ў чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у краіне налічваецца 855 тысяч сем'яў.
Аднак будаваць жыллё з дзяржпадтрымкай па новых правілах Указа № 13 змогуць цяпер толькі каля 376 тысяч такіх чаргавікоў.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што летась у краіне было пабудавана 5,5 млн кв. метраў жылля і каля 100 тысяч жыллёвых квадратаў за межамі дзяржавы. Сёлета плануецца пабудаваць 4,2 млн кв. м і прыкладна 1 мільён кв. м жылля за мяжой. Ужо цяпер у краіне пабудавана 376 тысяч кв. м жылля, што амаль удвая больш, чым за адпаведны перыяд летась, або 9% ад гадавога задання.

Усяго на жыллёвае будаўніцтва сёлета плануецца выдаткаваць 20 трлн рублёў, дзе памер ільготных крэдытных рэсурсаў складзе каля 40 % ад агульнага аб'ёму фінансавання. За гэтыя грошы ў краіне будзе пабудавана 62 тысячы кватэр для ўсіх катэгорый насельніцтва. Запланавана пабудаваць 2,6 млн кв. м жылля з дзяржпадтрымкай.

Зараз будаўнічая галіна мае каласальныя вытворчыя магутнасці, якія дазваляюць будаваць каля 10 млн кв. м жылля за год, але... Сёння краіна ўжо не мае магчымасці ажыццяўляць масавае будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай за кошт эмісійнага фінансавання.

У мінулыя гады тэмпы будаўніцтва штогод павялічваліся, але жыллёвая чарга не змяншалася. Асобныя прадпрымальныя грамадзяне за 5 гадоў маглі пабудаваць сабе больш за адну кватэру, такое будаўніцтва з дзяржпадтрымкай стала бізнэсам. Напрыклад, сёння ў Мінску 5,5 тысячы грамадзян маюць ва ўласнасці дзве кватэры, 5,5 тысячы мінчан — 3 кватэры, 742 гаспадары — 4 кватэры, 175 жыхароў — 5 кватэр, а 138 чалавек маюць 6 і больш кватэр.

СТАР. 2

Воінам-інтэрнацыяналістам, ветэранам вайны ў Афганістане

Паважаныя таварышы!

Сёння ў нашай краіне адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Падзяляючы боль страты, мы шчыра спачуваем тым, хто не дачакаўся сваіх сыноў, мужоў, братоў.

Савецкія салдаты з гонарам выконвалі свой абавязак у Афганістане, не здрадзіўшы прысязе, часта цаной уласнага жыцця. Імкнучыся ўсталяваць мір у змучанай крывавымі разладамі краіне, нашы байцы праяўлялі мужнасць і гераізм. Многія з іх адзначаны баявымі ўзнагародамі.

Сучасны свет не стаў больш добрым, спакойным і бяспечным, колькасць «гарачых кропак» на зямным шары не змяншаецца. Таму абарона Айчыны ад новых пагроз і выклікаў заўсёды мае першараднае значэнне. Тым больш важкім становіцца ваш бясцэнны вопыт, набыты ў лакальных канфліктах. Вы ўносіце значны ўклад у падтрыманне стабільнасці ў грамадстве, выхаванне патрыятызму ў моладзі, з'яўляецеся прыкладам для падрастаючага пакалення.

Зычу вам, дарагія воіны-інтэрнацыяналісты, вашым родным і блізкім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Сёння — Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў

АБО МІР, АБО ЗАЧЫСТКА

Сёння ёсць нагода ўзняць трэці тост за тых, хто не вярнуўся з афганскай вайны. Па традыцыі так робяць тыя, хто быў у «гарачай кропцы»

У 1989-м, падчас выводу савецкіх войскаў з Афганістана, у краіне засталося шмат пакінутай зброі і боепрыпасаў. Разам з тым была вывезена неверагодная колькасць дакументаў. Большасць з іх дагэтуль застаюцца засакрэчанымі. Пэўныя старонкі той жорсткай гісторыі прыадкрываюцца, але, галоўным чынам, дзякуючы ўспамінам, якімі могуць падзяліцца ветэраны баявых дзеянняў.

ПАЛКОЎНІК Котаў займаўся ў Афганістане міратворчай дзейнасцю — шукаў агульную мову з верхаводамі бандыцкіх фарміраванняў. Калі ўстанавіць мір не ўдавалася — браў удзел у падрыхтоўцы «зачыстак»... Зусім нядаўна Котаў стаў звычайным пенсіянерам. Пражывае ў Мінску адзін — жонкі вось ужо як чатыры гады няма... Двое старэйшых дзяцей жывуць таксама ў сталіцы, гадуюць уласных малых. Малодшая дачка пераехала за мяжу, у яе таксама свая сям'я, двое дзяцей.

ВАЛЕРЫЙ нарадзіўся ў Новасібірскай вобласці. Скончыў там школу і Новасібірскі машынабудаўнічы інстытут, працаваў на заводзе. Быў сакратаром камсамольскай арганізацыі канструктарскага бюро.

— Мне прапанавалі ісці ў органы дзяржаўнай бяспекі, і я даў згоду, — расказвае Валерый Аляксандравіч. — Спачатку, у 1962 годзе, мяне накіравалі на вучобу ў Мінск. Праз год я вярнуўся назад і пачаў працу ў апараце КДБ у горадзе Барабінску Новасібірскай вобласці... Яшчэ праз год быў пераведзены ў Новасібірск... На той момант я ўжо быў жанаты на мінчанцы, і яна паўсюль ездзіла са мной. Акрамя Афганістана, вядома...

Аднойчы Валерый падаў рапарт, і яго перавялі ў Мінск. Праз пятнаццаць гадоў службы ў беларускай сталіцы яго разам з жонкай накіравалі ў Гродна. Гэта было павышэнне — пасада начальніка аддзела. Тут, у Гродна, Котаў і выйшаў на пенсію. І было гэта, зразумела, пасля Афганістана.

СТАР. 7

БПС-СБЕРБАНК

ОАО «БПС-СБЕРБАНК» ИНФОРМИРУЕТ:

В связи со снижением с 15.02.2012 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с 45% до 43% годовых, ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает с 15.03.2012 по банковским депозитам физических лиц в белорусских рублях следующий размер процентов:

- по привлеченным до 15.02.2012 депозитам

Наименование депозита/ сумма вклада	Размер процентов (годовых) по срокам привлечения		
	90–189 дней	190–369 дней	370–500 дней
«Сохраняй»			
от 500 тыс. – до 5 млн.	49,5 (СР+6,5 п.п.)	51 (СР+8 п.п.)	52 (СР+9 п.п.)
от 5 млн. – до 25 млн.	51 (СР+8 п.п.)	52 (СР+9 п.п.)	52,25 (СР+9,25 п.п.)
от 25 млн. – до 100 млн.	52 (СР+9 п.п.)	52,25 (СР+9,25 п.п.)	52,5 (СР+9,5 п.п.)
от 100 млн.	52,25 (СР+9,25 п.п.)	52,5 (СР+9,5 п.п.)	53 (СР+10 п.п.)
«Пополняй»			
от 500 тыс. – до 5 млн.	49,25 (СР+6,25 п.п.)	50,75 (СР+7,75 п.п.)	51,75 (СР+8,75 п.п.)
от 5 млн. – до 25 млн.	50,75 (СР+7,75 п.п.)	51,75 (СР+8,75 п.п.)	52 (СР+9 п.п.)
от 25 млн. – до 50 млн.	51,75 (СР+8,75 п.п.)	52 (СР+9 п.п.)	52,25 (СР+9,25 п.п.)
от 50 млн. – до 100 млн.	52 (СР+9 п.п.)	52,25 (СР+9,25 п.п.)	52,5 (СР+9,5 п.п.)
от 100 млн.	52,2 (СР+9,2 п.п.)	52,4 (СР+9,4 п.п.)	52,9 (СР+9,9 п.п.)
«Управляй»			
1,5 млн.	48 (СР+5 п.п.)	49 (СР+6 п.п.)	50 (СР+7 п.п.)
5 млн.	49,5 (СР+6,5 п.п.)	50,5 (СР+7,5 п.п.)	51 (СР+8 п.п.)
25 млн.	51 (СР+8 п.п.)	51,5 (СР+8,5 п.п.)	52 (СР+9 п.п.)
100 млн.	51,5 (СР+8,5 п.п.)	52 (СР+9 п.п.)	52,5 (СР+9,5 п.п.)
Депозит и карт-счет «Пенсионный» – 43 (СР)			

- по ранее отмененным депозитам

Наименование депозита	Срок привлечения	Размер процентов (годовых)		
		за 1-й – 4-й месяцы	за 5-й – 10-й месяцы	за 11-й – 12-й месяцы
«Баланс интересов»	1 год	49 (СР + 6)	50 (СР + 7)	51 (СР + 8)
«Перспективный»	18 месяцев	51 (СР + 8)		
«К совершеннолетию»	2 года	46 (СР + 3)		
	3 года	47 (СР + 4)		

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по телефонам:

- **148** (в стационарной сети);
- МТС **(029) 5-148-148, 2-148-148**; Velcom **(044) 77-00-148, 77-55-148.**

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2011 г. (млрд. руб.): январь – 6,1; февраль – 6,0; март – 6,6; апрель – 6,2; май – 7,2; июнь – 7,5; июль – 8,7; август – 10,9; сентябрь – 13,1; октябрь –16,7; ноябрь – 19,5; декабрь – 24,1.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Сбербанк».

Памяць вайны

Па прапанове ветэранаў Вялікай Айчыннай...

... учора ў рэдакцыі «Звязды» прайшоў «круглы стол» «Гісторыя Перамогі: недапушчэнне фальсіфікацый Вялікай Айчыннай вайны, ушанаванне подзвігу партызан і падпольшчыкаў»

НАША газета традыцыйна шмат увагі ўдзяляе пытанням гісторыі вайны, прынцыпова выступае супраць тэндэнцыйных памкненняў і спроб перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай — гісторыю народнай трагедыі, народнай барацьбы і народнай Перамогі.

«Звязда», якая з мая 1942 года выдавалася журналістамі-патрыётамі ва ўмовах мінскага падполля, а са студзеня 1943-га і да самага вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў — сярод непразлазных балот на востраве Выслаў Любанскага раёна, катэгарычна не прымае гераізацыі калабарацыянізму, імкнецца ставіць надзейную заслону хлусні, якая захутваецца ў адзенне праўдападобнасці...

Вось і ўчора адбылася вялікая размова пра мінулае, дзень сённяшні і будучыню нашай Бацькаўшчыны. Удзел у ёй прымалі: **КАВАЛЕНЯ Аляксандр Аляксандравіч** — акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАНБ, доктар гістарычных навук, прафесар; **МІКУЛЬЧЫК Яўген Васільевіч** — старшыня камісіі па справах былых партызан і падпольшчыкаў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, старшыня ГА «Беларускі саюз афіцэраў», былы сувязны-разведчык партызанскага атрада імя Чапаева партызанскай брыгады «Полымя»; **БУЙКЕВІЧ Валянціна Пятроўна** — былая разведчыца дэсантнай разведвальна-дыверсійнай спецгрупы «Родныя»; **ДУБРОЎСКІ Мікалай Васільевіч** — удзельнік Сталінградскай бітвы, удзельнік вызвалення Беларусі, аўтар дакументальнай аповесці «Бессмяротнасць подзвігу» (пра забойства Кубэ); **ДАЎЖАНОК Васіль Пятровіч**, былы партызан партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы» імя Варанянскага; **ЧАРНАГЛАЗАВА Раіса Андрэеўна** — гісторык, у 1960—1990-х гадах — загадчыца аддзела партызанскага руху Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; **ЖУМАР Сяргей Уладзіміравіч** — намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы, кандыдат гістарычных навук; **ГАЛІНСКАЯ Ганна Васільеўна** — в.а. загадчыка экспазіцыйнага аддзела Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; **СКАРЫНКА Галіна Васільеўна** — галоўны захавальнік аддзела фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У адным з бліжэйшых нумароў газеты чытайце публікацыю матэрыялаў «круглага стала».

Таццяна ПАДАЛЯК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.02.2012 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	8 390,00	1 чэшская крона	440,44
▲ 1 еўра	11 030,00	1 польскі злоты	2 632,82
1 латвійскі лат	15 812,29	▲ 1 расійскі рубель	279,00
1 літоўскі літ	3 197,29	1 украінская грыўня	1 044,77

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,0868
10 UAH	37,4610
10000 BYR	35,3367
EUR	39,5431

Аўтограф Уладзіміра Грахова

15
ЛЮТАГА
2012 г.
СЕРАДА
№ 4 (15690)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

«ЗЛУЧАЕМ СЭРЦЫ»

Пад такой назвай у Дзень усіх закаханых у Мінску прайшла сумесная акцыя часопіса для ўсёй сям'і «Любимая» і моладзі. Каля трыццаці студэнтаў Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта пастроіліся ў форме сэрца, абняліся, а пасля павіншавалі гасцей гандлёвага цэнтра «Сталіца» паштоўкамі, паветранымі шарыкамі і часопісамі.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Беларуская моладзь адзначае 14 лютага інтэлектуальнымі баталіямі і дабрачыннымі акцыямі

У Дзень святога Валянціна закаханыя дораць адзін аднаму рамантычныя сувеніры і паштоўкі-валянцінкі. Беларуская моладзь не толькі пераймае гэтыя традыцыі, але прыдумвае свае спосабы цікава і з карысцю правесці гэта свята. Карэспандэнт БЕЛТА расказвае пра самыя арыгінальныя ідэі.

У Оршы 14 лютага праходзіць гарадскі турнір інтэлектуальных гульняў «Валянцінаўскія сустрэчы», які штогод збірае вялікую колькасць аматараў інтэлектуальных баталій і мазгавых штурмаў. У першых двух турах «Валянцінаўскіх сустрэч» вызначаць 12 лепшых каманд, яны і паспрачаюцца за званне пераможцы ў трэцім, рашаючым, конкурсе. На турніры ўдзельнікаў чакаюць не толькі складаныя заданні, але і святочныя віншаванні, а яшчэ ім трэба шляхам тайнага галасавання выбраць Міс і Містара Валянціна.

Арганізуе «Валянцінаўскія сустрэчы» Аршанскі гарвыканкам сумесна з актывістамі грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Дарэчы, у Магілёве хлопцы і дзяўчаты з БРСМ будуць разам з супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі несці дзяжурства на дарогах горада. У Дзень закаханых вадзіцелі атрымаюць сувеніры «Я люблю Беларусь» і яшчэ раз нагадаюць аб тым, што выконваць правілы дарожнага руху — значыць выказваць любоў і павагу да сябе і тых, хто побач.

Студэнты Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта з ліку валанцёраў руху БРСМ «Добрае сэрца» наведаюць з падарункамі дзяцей з сацыяльна-педагагічнага цэнтра Баранавіч. Грошы на падарункі студэнты сабралі з дапамогай незвычайнага аўкцыёну. Лотамі на ім былі кулінарныя шэдэўры, прыгатаваныя сваімі рукамі.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі 14 лютага стартуе конкурсна-забаўляльны марафон. Як расказала мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба БДУІР Наталля Башкірава, у кожным корпусе ўніверсітэта на вялікіх перапынках будуць працаваць імправізаваныя канцэртныя пляцоўкі. Акрамя таго, у ВНУ пройдзе паэтычны вечар, на якім будзе гучаць любоўная лірыка Ганны Ахматавай, Марыны Цвятаевай, Роберта Раждественскага і іншых паэтаў XIX-XX стагоддзяў. Прадоўжыцца святочны марафон да 16 лютага, у гэты дзень лепшыя вакальна-інструментальныя калектывы БДУІР выступяць з канцэртам «Ракавое каханне».

У многіх навучальных установах краіны ў Дзень святога Валянціна выбіраюць самую рамантычную пару. У Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту для гэтага правядуць інтэрнэт-галасаванне, а ў аграрна-тэхнічным каледжы імя У.Е. Лабанка закаханым трэба будзе адстойваць званне лепшых у конкурснай шоу-праграме «Два сэрцы».

МАГІСТРАТУРА ПАДЗЯЛІЛАСЯ НА ДЗВЕ ПЛЫНІ

У 2012 годзе ў Беларусі адкрыецца набор у практыка-арыентаваную магістратуру. Упершыню выпускнікам вышэйшай школы, якія навучаліся на I ступені, будуць прапанаваны адукацыйныя праграмы II ступені вышэйшай адукацыі, разлічаныя на паглыбленую падрыхтоўку спецыялістаў для інавацыйнай дзейнасці ў галінах эканомікі, навукі і сацыяльнай сферы. Нарматыўны прававы акт, які рэгулюе парадак прыёму і ўмовы арганізацыі ўступных выпрабаванняў і залічэння асоб для атрымання вышэйшай адукацыі на II ступені, быў зацверджаны Пастановай Савета Міністраў № 110 ад 2 лютага 2012 года.

Як патлумачылі ў прэс-службе галоўнага адукацыйнага ведамства, дзеянне новага дакумента распаўсюджваецца на ўсе ўстановы вышэйшай адукацыі, незалежна ад формы ўласнасці і падпарадкавання. Галоўная ўмова — у навучальнай установе павінны рэалізоўвацца ў вочнай і завочнай формах два віды праграм: адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі II ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы, а таксама адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі II ступені з паглыбленай падрыхтоўкай спецыяліста, якая таксама забяспечвае атрыманне ступені магістра. Такім чынам, пры наяўнасці адпаведнай матэрыяльна-тэхнічнай базы і прафесарска-выкладчыцкага складу падрыхтоўку практыка-арыентаваных магістраў змогуць ажыццяўляць ВНУ як дзяржаўнай, так і прыватнай формы ўласнасці.

Згодна з пастановай урада, кантрольныя лічбы прыёму ў ВНУ для атрымання вышэйшай адукацыі II ступені будуць вызначаюцца наступным чынам: набор у практыка-арыентаваную магістратуру дапускаецца ў межах 7% ад колькасці выпускнікоў бягучага года, якія навучаліся на I ступені, і ў межах 7% — у магістратуру з праграмай падрыхтоўкі спецыялістаў для навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы.

Неабходнасць у нарматыўным і прававым рэгуляванні гэтага напрамку была абумоўлена запланаваным уступленнем Беларусі ў Балонскі працэс. Справа ў тым, што ў большасці краін — удзельніц Балонскага працэсу II ступень вышэйшай адукацыі з'яўляецца практыка-арыентаванай. А ў нашай краіне магістратура часцей за ўсё разглядаецца як прыступка для працягу навучання ў аспірантуры і прысвячэння сябе выкладчыцкай або навукова-даследчай дзейнасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БДУ прарваўся ў рэйтынгу Webometrics у 3 % лепшых

Па апошніх звестках Сусветнага рэйтынгу Webometrics, апублікаваных 2 лютага 2012 года, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт узняўся ў ім яшчэ на 365 пазіцый і прарваўся ў першую тысячу, заняўшы 843 месца ў свеце.

Трэба патлумачыць, што розныя агенцтвы пры складанні рэйтынгаў карыстаюцца рознымі крытэрыямі, не заўсёды празрыстымі і зразумелымі для ўсіх, але факт застаецца фактам: часцей за ўсё ў сусветных рэйтынгах фігуруюць ВНУ англамоўнай прасторы. У адрозненне ад многіх іншых міжнародных рэйтынгаў, праект Webometrics ацэньвае, так бы мовіць, «бачнасць» ВНУ ў інтэрнэт-прасторы. Ён больш маштабны, чым «шанхайскі» ці «таймсаўскі». За кошт тэхналагізацыі працэдуры складання рэйтынгу даследчая група ахоплівае больш як 20 тысяч універсітэтаў (а усяго ў свеце дзейнічае каля 30 тысяч ВНУ). Таму карціна развіцця сусветных універсітэтаў, заснаваная на вэб-індыкатарах, аказваецца больш адэкватнай рэчаіснасці. Гэта самы поўны аналіз дзейнасці ВНУ, незалежна ад іх знаходжання на сусветнай карце. Рэйтынг публікуецца два разы на год і адлюстроўвае ўсе дастаткова сур'ёзныя змяненні па прасоўванні дзейнасці ВНУ ў віртуальнай прасторы.

Агульны паказчык рэйтынгу Webometrics вызначаецца падсумаваннем узважаных у працэнтах значэнняў чатырох індыкатараў: колькасць старонак, якая фіксуецца пошукавымі сістэмамі Google, Yahoo, Live і Search Exalead; колькасць унікальных знешніх спасылак ад Yahoo; «насычаныя» файлы, прадстаўленыя ў фарматах pdf, ps, dos і ppt, і навуковая інфармацыя — дакументы, даклады, публікацыі, якія ўтрымліваюцца ў базе Google Scholar. Напрыклад, па такім паказчыку, як «навука», БДУ за апошняе паўгоддзе ўзняўся на 72 пазіцыі і ўвайшоў у 500 лепшых універсітэтаў свету.

Сярод універсітэтаў краін СНД Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт знаходзіцца ў рэйтынгу на дзявятым месцы, прапусціўшы наперад толькі восем расійскіх ВНУ, у тым ліку Маскоўскі, Санкт-Пецярбургскі і Новасібірскі ўніверсітэты. А пяцёрка сусветных лідараў па версіі Webometrics выглядае наступным чынам: узначальвае рэйтынг Гарвардскі ўніверсітэт, другое месца — у Масачусецкага тэхналагічнага інстытута, трэцяе — у Стэндфардскага ўніверсітэта. Далей ідуць Мічыганскі і Каліфарнійскі ўніверсітэты. Лепшым еўрапейскім універсітэтам з'яўляецца Кембрыджскі, у якога 24-я пазіцыя.

На думку міністра адукацыі Сяргея Маскевіча, пры адпаведным карэктаванні сваёй вэб-палітыкі абсалютна любая беларуская ВНУ можа дабіцца істотнага прасоўвання ў вебаметрычным рэйтынгу. Аднак летась толькі 7 з 38 беларускіх ВНУ, прадстаўленых у рэйтынгу Webometrics, змаглі палепшыць свае пазіцыі.

— Адукацыя — гэта сур'ёзны рынак, дзе ёсць мноства гульцоў. Абітурыенты і студэнты кіруюцца рэйтынгамі пры выбары месца, дзе яны хацелі б прадоўжыць навучанне. Працадаўцы цікавяцца рэйтынгамі, каб ведаць, якія ўніверсітэты рыхтуюць лепшых спецыялістаў. І калі Беларусь нацэлена на пашырэнне экспарту адукацыйных паслуг, то ігнараваць інтэрнэт-рэсурс проста недаравальна, — падкрэслівае кіраўнік адукацыйнай галіны.

Між іншым, цяпер менавіта ў БДУ навучаецца самая вялікая колькасць замежных грамадзян. І многія з іх упершыню пазнаёміліся з універсітэтам, менавіта дзякуючы яго інтэрнэт-сайту.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Пазіцыя Беларусі па прысутнасці яе ВНУ ў інтэрнэце (наведвальнасць сайтаў, каштоўнасць і актуальнасць прадстаўленай інфармацыі):

ЗША —	*1*
Кітай—	*2*
Японія—	*3*
Германія —	*4*
Вялікабрытанія —	*5*
Расія —	*6*
Карэя —	*7*
Польшча—	*8*
Францыя —	*9*
Украіна —	*17*
Латвія —	*32*
Літва —	*39*
Грузія —	*47*
Азербайджан —	*57*
Казахстан —	*65*
Беларусь —	***66***
Арменія —	*69*
Узбекістан —	*71*
Малдова —	*72*

На пасяджэнні Прафесарскага сходу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта яго рэктар акадэмік Сяргей Абламейка папрасіў прафесараў і выкладчыкаў актывізаваць сваю дзейнасць у сферы публікацыі навуковых работ. Ён падкрэсліў, што публікацый толькі ў беларускіх навуковых часопісах недастаткова, паколькі дзейнасць універсітэта ацэньваецца па значнасці і колькасці друкаваных работ навукоўцаў у міжнародных выданнях.

Актыўнасць на сайце будзе матэрыяльна заахвочвацца

Рэктар адзначыў, што ва ўсім свеце прынята выкладваць на сайт ВНУ матэрыялы лекцый, і заклікаў выкладчыкаў універсітэта заводзіць асабістыя старонкі на сайце, прычым размяшчаць там не толькі агульную інфармацыю пра сябе, але і змест курсаў, якія яны чытаюць. «Пры прыняцці рашэння аб прымяненні павышальных каэфіцыентаў пры налічэнні заработнай платы будзе ўлічвацца прысутнасць матэрыялаў выкладчыкаў на сайце БДУ», — паабяцаў Сяргей Абламейка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У Беларусі плануецца заканадаўча замацаваць абавязак дарослых суправаджаць дзяцей пасля 23.00

Факт

Аб гэтым паведаміў журналістам старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка. Ён прыняў удзел у прамой тэлефоннай лініі з насельніцтвам Мінскай вобласці.

Такая норма змяшчаецца ў законапраекце , які знаходзіцца на разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў.

«З 23.00 да 6.00 дзеці да 16 гадоў не будуць мець права знаходзіцца па-за домам без бацькоў або без людзей, якія іх апякуюць. Гэта значыць з імі ў начны час павінны быць паўналетнія. Гэта трэба, каб абараніць дзіця ад магчымага насілля, каб яно не ўчыняла проціпраўных дзеянняў», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Калі ж непаўналетнія будуць гуляць пасля 23.00 без суправаджэння, то для бацькоў надыходзіць адміністрацыйная адказнасць. У такіх выпадках работнік міліцыі абавязаны дзіця на працягу трох гадзін даставіць дадому. Калі месца знаходжання бацькоў не ўстаноўлена, то непаўналетні падлягае змяшчэнню ў сацыяльна-педагагічны цэнтр.

Абітурыент-2012

ЦІ ЗАЛЕЖЫЦЬ ЯКАСЦЬ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ АД ФОРМЫ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ?

«Задача павышэння якасці адукацыі застаецца адной з самых актуальных для нашай школы, — заявіў на выніковай калегіі свайго ведамства міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ. — На жаль, узровень ведаў абітурыентаў па дзяржаўных мовах, матэматыцы, фізіцы хоць і супастаўны з паказчыкамі многіх еўрапейскіх краін, аднак усё роўна застаецца параўнальна невысокім».

На думку міністра, вынікі тэсціравання — вельмі важны і адначасова трывожны сігнал для работнікаў адукацыі, паколькі аналіз вынікаў ЦТ выяўляе штогод у ведах абітурыентаў такія прабелы, якіх у прынцыпе быць не павінна. Менавіта таму Нацыянальнаму інстытуту адукацыі і ўпраўленням адукацыі было даручана разабрацца ў прычынах памылак, якія абітурыенты дапускаюць, адказваючы на элементарныя пытанні ў тэстах, і прапанаваць дзейсныя захады па выпраўленні сітуацыі.

Можна не сумнявацца, што грамадскасці было б цікава даведацца, а як самі школьныя настаўнікі спраўляюцца з тэстамі? Дарэчы, ва ўсіх раёнах Гомельскай вобласці нядаўна было праведзена дыягнастычнае тэсціраванне, у якім узялі удзел каля 1300 настаўнікаў матэматыкі. У тэстах, прапанаваных педагогам, выкарыстоўваліся заданні цэнтралізаванага тэсціравання 2006-2010 гадоў. Галоўнай мэтай было выявіць праблемныя моманты, якія ўзнікаюць у настаўнікаў пры выкананні тэстаў. Азнаёміцца з вынікам сваёй работы і тэматычным аналізам памылак настаўнікі маглі па кодавым слове, паколькі пры праверцы захоўваліся прынцыпы канфідэнцыяльнасці. Хочацца спадзявацца, што Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі і органы кіравання адукацыяй атрымалі багатую інфармацыю для роздуму.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання — гэта менавіта той матэрыял, які дазваляе своечасова карэктаваць вучэбную праграму, вучэбныя планы, школьныя падручнікі, дапаможнікі і навучальныя тэхналогіі, — дзеліцца сваімі думкамі **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — Мы штогод аналізуем самыя тыповыя памылкі, якія абітурыенты дапускаюць на ЦТ, здзяйсняем вялікі аб'ём работы, выпускаем зборнікі з аналітычнай інфармацыяй, аднак характар памылак абітурыентаў не змяняецца. Выходзіць, што наша аналітычная інфармацыя не бярэцца педагогамі пад увагу? І, шчыра кажучы, мы стаміліся ўжо ад папрокаў у празмернай складанасці тэстаў. Адкажыце, калі ласка, на адно вельмі простае пытанне: «Ці можна абвінаваціць прыбор для вымярэння артэрыяльнага ціску ў гіпертанічнай хваробе пацыента?» Дык чаму ў тым, што веды некаторых беларускіх абітурыентаў моцна «кульгаюць», абвінавачваюць цэнтралізаванае тэсціраванне? Фактычна ЦТ выконвае функцыю таго самага танометра — «высвечвае» ў падрыхтоўцы беларускіх школьнікаў тыя ці іншыя праблемы... Упэўнены, што для школьных настаўнікаў, складальнікаў падручнікаў і тых, хто працуе над вучэбнымі праграмамі, вынікі тэсціравання могуць быць своеасаблівай лакмусавай паперкай...

Трэба прызнаць, што праблема з якасцю школьнай адукацыі характэрная сёння для многіх краін. Напрыклад, калі галандцы вырашылі пратэсціраваць базавыя ўменні і навыкі па матэматыцы першакурснікаў педагагічных факультэтаў, то высветлілася, што ведамі, якія адпавядаюць патрабаванням стандарту, могуць пахваліцца толькі 20% студэнтаў першага курса, і каля паловы з іх увогуле «не сябруюць» з арыфметыкай. А калі вынікі 18-гадовых першакурснікаў параўналі з вынікамі 12-гадовых школьнікаў, то высветлілася, што апошнія ведаюць матэматыку лепш, чым студэнты першага курса педагагічных факультэтаў. Зрэшты, тое ж тычылася і ведання роднай мовы. Прыкладна палова галандскіх першакурснікаў педагагічных факультэтаў не змагла паспяхова выканаць прапанаваныя тэсты. Галандцы, як і мы, у разгубленасці...

ХТО Ў «ГРУПЕ РЫЗЫКІ»?

Азадачаны праблемамі школьнай адукацыі і ў Расіі. Адзіны дзяржаўны экзамен па-ранейшаму з'яўляецца аб'ектам спрэчак расійскіх экспертаў, палітыкаў і прадстаўнікоў грамадскасці. Між тым за гады яго правядзення АДЭ аказаў відавочны уплыў як на сістэму школьнай адукацыі, так і на сістэму вышэйшай адукацыі ў Расіі. А нядаўна ў Расіі было праведзена цікавае даследаванне на тэму «Пра што сведчаць вынікі Адзінага дзяржаўнага экзамену?», якое дало вельмі цікавую інфармацыю для роздуму. Напрыклад, дрэнна гэта ці добра, што ў Расіі кожны дзясяты не ў стане якасна засвоіць праграму старэйшых класаў? Па выніках даследавання, у «групе рызыкі» на АДЭ знаходзяцца каля 10% школьнікаў. Гэта тыя абітурыенты, якія не могуць перасягнуць вызначаную мінімальную мяжу ў балах. Тая ж статыстыка, толькі ўжо замежная, паказвае: прыкладна такі ж працэнт непаспяховых вучняў і ў Германіі, і ў ЗША, і нават у краіне, якая заткнула ўсіх за пояс па якасці школьнай адукацыі — у Фінляндыі. У Германіі такія дзеці сыходзяць пасля 9 ці 10 класа ў вучылішчы і, атрымаўшы прафесію, нядрэнна зарабляюць, цалкам задаволены сваім жыццём і кар'ерай. А ў Расіі (як, дарэчы, і ў Беларусі) пераважная большасць выпускнікоў сярэдніх школ нацэленыя на атрыманне вышэйшай адукацыі, прычым незалежна ад іх схільнасцяў і здольнасцяў...

І вось што характэрна: у Расіі, як і ў Беларусі, многія схільны спісваць правалы ў ведах школьнікаў на... форму экзаменацыйных выпрабаванняў. Маўляў, АДЭ як форма ацэнкі ведаў і навыкаў адмоўна ўплывае на якасць іх засваення.

Падчас аналізу вынікаў АДЭ высветлілася таксама, што дзяўчаты лепш здаюць адзіны дзяржаўны экзамен па гуманітарных прадметах. Уся справа ў тым, што прыгожаму полу лепш даюцца абстрактныя дысцыпліны і цяжэй — тыя, дзе даводзіцца мець справу з доўгімі формуламі. Але па дзейных правілах прыёму балы па АДЭ, патрэбныя для паступлення на абраную спецыяльнасць, проста падсумоўваюцца. Выходзіць, што дзяўчына, у якой 90 балаў па рускай мове, але ўсяго 60 балаў па фізіцы, мае больш шанцаў паступіць, чым таленавіты, але не вельмі пісьменны аматар фізікі з 90 баламі па профільным прадмеце і з 50 баламі па рускай мове. У выніку на інжынерных факультэтах хапае дзяўчат, якія, атрымаўшы дыплом, на вытворчасць працаваць ісці не збіраюцца. А хлопцы з прыроднымі задаткамі да тэхнічных навук паступаюць невядома куды толькі таму, што там ёсць свабодныя месцы і не патрабуюцца бліскучыя веды па мове. Вядома, выдатна, калі фізік ці матэматык без памылак піша на роднай мове і разбіраецца ў паэзіі. А калі ён разбіраецца толькі ў сваіх формулах? Кіраўнікі расійскіх ВНУ даўно прапаноўваюць увесці каэфіцыент, на які будуць памнажацца балы абітурыентаў па профільным прадмеце. Але ў 2012 годзе, хутчэй за ўсё, такіх змен не будзе. А вось праз год вышэйшым навучальным установам могуць дазволіць увесці такі каэфіцыент.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Даведка «Звязды»

У 2011 годзе 60% выпускнікоў агульнаадукацыйных школ сталі студэнтамі ВНУ (45,2 тысячы чалавек), 19% (14,2 тысячы чалавек) прадоўжылі сваё навучанне ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, і толькі 15,3% ад агульнай колькасці (усяго 11,6 тысячы чалавек) вырашылі атрымліваць прафесійна-тэхнічную адукацыю. Астатнія 4 тысячы чалавек былі або працаўладкаваныя, або прызваныя на службу ва Узброеных Сілах.

Пры гэтым цалкам укамплектавацца сёлета не ўдалося ні ВНУ, ні ССНУ, ні прафесійна-тэхнічным навучальным установам. У вышэйшых навучальных установах засталіся незапоўненымі 337 бюджэтных месцаў, або 1% ад кантрольных лічбаў набору, з іх 134 — на дзённай форме навучання (пераважна на спецыяльнасцях педагагічнага профілю: «беларуская мова і літаратура», «фізіка», «прафесійнае навучанне») і 203 — на завочнай. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах не знайшлося ахвотных на 400 бюджэтных месцаў (амаль палова незапоўненых бюджэтных месцаў — на дзённай форме навучання). А ў прафтэхустановах асноўныя цяжкасці назіраліся ва ўсіх рэгіёнах пры камплектаванні груп па прафесіях лёгкай прамысловасці, машынабудаўнічага профілю, сельскагаспадарчай вытворчасці, па спецыяльнасцях «прадавец», «цясляр», «сталяр», «станочнік станкоў па дрэваапрацоўцы» і «агароднік». Невыкананне кантрольных лічбаў набору склала 3,3 тысячы чалавек.

У чаканні прэм'еры

Які тэлеканал возьмецца паказаць унікальнае моладзевае драмедзі?

Першы серыял аб беларускай моладзі, сучасным Мінску, у якім будзе прадстаўлена лепшая сучасная беларуская музыка, фактычна гатовы да паказу на адным з беларускіх тэлеканалаў. Фільм «Вышэй за неба» зняты па ініцыятыве Праграмы развіцця ААН у межах гранта Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. Першы падобны кінапраект у Беларусі закліканы разбурыць шэраг стэрэатыпаў, якія існуюць у тэме ВІЧ і СНІДу, спрыяць уцягванню моладзі ў абмеркаванне актуальных пытанняў, звязаных з гэтай тэмай. Героі фільма перажываюць няпростыя сітуацыі, якія ставіць перад імі жыццё.

Паводле слоў **прадстаўніка ААН/ПРААН у Беларусі Антоніуса БРУКА,** фільм «Вышэй за неба» створаны ў першую чаргу для прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі, дзеля зніжэння дыскрымінацыі ў дачыненні да ВІЧ-пазітыўных асоб. Праз свет мастацтва ўнікальны праект раскрывае важныя сацыяльныя пытанні, узнімае тэму каштоўнасцяў кахання, дружбы і сям'і. У фільме ўзялі ўдзел акцёры-пачаткоўцы, якія прайшлі «народны» кастынг, а таксама папулярныя музыканты, артысты, спартсмены. Жанр серыяла — моладзевае драмедзі (жанр, які спалучае драму і камедыю), фармат — 8 серый па 44 хвіліны.

Галоўны герой серыяла — малады беларус Мікіта Міцкевіч. Яму каля 20 гадоў, жыве і вучыцца ў Мінску. Ён музыкант, кампазітар, іграе ў моднай мінскай групе. Хлопец смелы, харызматычны, стыльны — ікона для дзяўчат і прыклад для пераймання для хлопцаў. Жыве паводле сваіх прынцыпаў і не гатовы паступацца імі дзеля грошай. Мікіта атрымлівае задавальненне ад свайго жыцця і верыць, што свет цудоўны. У яго адбываецца барацьба за лідарства з вакалістам групы Стасікам, прыгажунчыкам, які залічыў сябе ў «зоркі». Група больш на баку Мікіты... Але тут адбываецца падзея, якая пераварочвае ўсё яго жыццё.



Выканаўца ролі Мікіты Леанід Пашкоўскі і Юля, першае каханне Мікіты — Вераніка Барцэвіч.

Ці зможа Мікіта падняцца вышэй за ўласныя страхі, прадузятасць навакольных, знайсці сапраўдных сяброў і сапраўднае каханне? Ці ўдасца Мікіту і яго сябрам заваяваць галоўны прыз, за які змагаюцца моладзевыя музычныя гурты? Ці зможа Мікіта стаць свабодным духам, што непарыўна звязана з адказнасцю за ўласнае жыццё і жыццё блізкіх? Адказы на гэтыя пытанні ёсць у новым беларускім моладзевым серыяле.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Ведай нашых

КАМП'ЮТАРНАЯ ГУЛЬНЯ МАЛАДОГА ПАТРЫЁТА

Магілёўскія студэнты распрацавалі камп'ютарныя віктарыну і крыжаванку па гісторыі і культуры Беларусі

Аляксандр Бельскі і Андрэй Дзятлаў з Магілёўскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа занялі са сваімі работамі прызавыя месцы на рэспубліканскім конкурсе па распрацоўцы камп'ютарных гульняў патрыятычнай скіраванасці.

Правільны студэнт

Магілёўцу Аляксандру Бельскаму 18 гадоў, ён студэнт 3 курса каледжа, вывучае праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій. Камп'ютарную віктарыну па гісторыі і культуры Беларусі зрабіў у межах курсавога праекта.

Цяпер усе, здаецца, ужо прыйшлі да камп'ютараў, і цяжка знайсці маладога чалавека, які б не карыстаўся інтэрнэтам. Аднак усё ж праграмаванне — гэта сур'ёзная справа, і Саша Бельскі стаў захапляцца ім яшчэ са школы. Яго маці — медык, бацька — прадпрымальнік, а сын абраў сабе адну з найбольш перспектыўных прафесій у свеце, дзе імкліва развіваюцца новыя інфармацыйныя тэхналогіі.

Аляксандр, на мой погляд, уяўляе сабой вобраз сучаснага «правільнага» маладога чалавека: моднае адзенне і прычоска, ветлівасць да суразмоўцаў, добрая мова (пераход з рускай на беларускую адбываецца без цяжкасцяў), разумныя думкі, актуальныя гаджэты (тэлефон, флэшка, ноўтбук), і нават сярэбраны пярсцёнак-абярэг. Бельскі з'яўляецца старастам групы ў каледжы і нядаўна разам са студэнтамі браў удзел у дабрачыннай акцыі па набыцці памперсаў для немаўлят, якія засталіся без апекі бацькоў. На канікулах ён ездзіць у вандроўкі па Беларусі, глядзіць новыя кінафільмы, чытае кнігі (апошняя — «Анёлы і дэманы» Дэна Браўна).

Віктарына Бельскага — гэта камп'ютарная гульня, якая можа быць і забавай, і тэстам у навучальным працэсе. Яе ідэю, расказвае Бельскі, падказалі выкладчыкі, а далей пайшло развіццё. На гэта спатрэбілася некалькі тыдняў: студэнт сам шукаў пытанні і адказы па тэмах.

— Увогуле, я патрыёт, — Сашу не бянтэжаць гучныя словы. — Мне падаецца, што ў кожнага беларуса павінны быць веды па гісторыі і культуры сваёй радзімы. Не проста ў тэорыі, але і на практыцы.

На рэспубліканскі конкурс патрыятычных камп'ютарных гульняў прадставілі 60 работ з усёй краіны. Бельскі заняў другое месца.

Віртуальная гісторыя

Будучы праграміст паказвае гульню ў камп'ютары. Ён так хутка клікае «мышкай», што не паспяваеш прасачыць. Аднак схема віктарыны аказалася даволі простай: для адказу на пытанне трэба націснуць на правільную карцінку. Калі правільна — чуецца гук. Першы раздзел — пра гістарычных асоб Беларусі. Пытанне пра першадрукара і пераможца Бібліі на беларускую мову не выклікае цяжкасцяў: выяву Францыска Скарыны памятаюць усе. Геаграфічны раздзел таксама паддаецца дастаткова хутка.

Найбольш складанай аказалася тэма беларускіх пісьменнікаў: на партрэтах мы пазналі Быкава, Караткевіча і Дударава, а вось з Чаротам і Лыньковым — памылілі ліся. Кап'ютар выстаўляе адзнаку (ад 1 да 10), і, калі шчыра, да «выдатна» аказалася значна далей, чым да «дрэнна».

Адметнасць камп'ютарнай гульні — яшчэ і ў магчымасці стварэння новых раздзелаў віктарыны: любых, якія будуць патрэбны выкладчыкам. За некалькі хвілін Саша робіць новы раздзел на веданне сцягоў розных краін.

— Мне здаецца, што менавіта дзякуючы такім сучасным праектам можна зацікавіць сваёй гісторыяй і культурай, — каментуе Бельскі. — У век тэхналогій гэта добры спосаб заахвоціць маладых людзей. Думаю, што такая віктарына на ўроку — нешта новае і інтэрактыўнае. Можна яе зрабіць і на беларускай мове.

Удзел, а тым больш перамогі ў рэспубліканскіх конкурсах, фінансава выгадныя для студэнта, робіць акцэнт **намеснік дырэктара па вучэбнай працы Магілёўскага політэхнічнага каледжа Валянціна БАНСЮКОВА**. Маюцца на ўвазе не толькі прызы ў выглядзе флэшкі ды майкі ад арганізатараў, але і істотная даплата да стыпендыі. Для Аляксандра Бельскага, які і так добра вучыцца, імянная стыпендыя Скарыны з даплатай склалася ў суму 750 тысяч рублёў. Разам з зароблены за падпрацоўкі па праграмаванні атрымліваюцца грошы, якія вядуць студэнта да спраўджвання мары аб набыцці нэтбука.

Прыярытэты праграміста

— Камп'ютар — адназначна не вораг, а сябар чалавека, — перакананы Аляксандр. — Ён робіць больш лёгкімі зносіны паміж людзьмі.

— Дрэнна, калі маладыя людзі занятыя толькі камп'ютарам, — лічыць выкладчыца інфарматыкі каледжа і настаўніца Бельскага Антаніна Пікуліна. — Моладзь шмат інфармацыі атрымлівае, але мова іх зносін зусім бедная, часам падлеткі двух слоў звязаць не могуць...

— Інтэрнэтам можна і трэба карыстацца, бо там шмат карыснага, — гаворыць Аляксандр. — Але ў разумных межах. Я штодзень праводжу з камп'ютарам па 6-8 гадзін. Гэта хоць і шмат, але не залежнасць. Такая хвароба існуе, і яна небяспечная.

Праграмаванне — папулярная спецыяльнасць у каледжы. У той год, калі паступаў Саша, конкурс быў 9 чалавек на месца. Аднак не ўсе разумеюць, што камп'ютарныя праграмы не падобныя на маляўнічыя гульні, а ўяўляюць сабой шарэнгі літар і лічбаў, якія могуць складвацца ў адзінае цэлае месяцамі.

— Бацькі часта вядуць сваіх дзяцей да нас на той падставе, што падлетак «любіць камп'ютар» і «добра яго ведае», але гэтага часта аказваецца недастаткова, — кажа завуч.

— Для таго, каб стаць добрым праграмістам, патрабуюцца не толькі жаданне і імкненне, але і матэматычны лад мыслення, — лічыць выкладчыца.

Праграмаванне — сапраўды вельмі перспектыўная справа: асабліва калі выпускнікі каледжа працягваюць адукацыю ў вышэйшай навучальнай установе. Добрыя праграмісты сёння зарабляюць някепскія грошы, і не толькі ў замежжы, але і ў Беларусі.

— Трэба проста правільна расставіць прыярытэты, вызначыць, чаго ты хочаш у жыцці і навошта табе гэта патрэбна, — вельмі падарасламу разважае 18-гадовы студэнт-праграміст. — Калі расставіш правільна — тады ўсё атрымаецца. Мае прыярытэты: паспяхова закончыць каледж, паступіць у ВНУ, а потым уладкавацца на працу з добрым заробкам. І жыць у сваёй краіне. Я думаю, што ў Беларусі добрыя перспектывы.

Ілона ІВАНОВА.

ЦІ ЗАЛЕЖЫЦЬ ЯКАСЦЬ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ АД ФОРМЫ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ?

СЯРЭДНІ БАЛ УДЗЕЛЬНІКАЎ ЦТ — НЕ АРЫЕНЦІР ДЛЯ ПАСТУПЛЕННЯ

У Беларусі правілы прыёму ў ВНУ на 2012 год яшчэ не зацверджаны, тым не менш вядома, што і ў нас «вага» профільнай дысцыпліны пры паступленні на біялагічныя, матэматычныя, фізічныя і хімічныя спецыяльнасці будзе павышана. Для другой профільнай дысцыпліны прапануецца ўвесці каэфіцыент два. А па выніках прыёмнай кампаніі будзе зроблена выснова аб мэтазгоднасці пераносу гэтай нормы і на іншыя спецыяльнасці... Будзе ўведзены таксама і ніжні парог, які не дазволіць удзельнічаць у конкурсе абітурыентам з вельмі нізкімі баламі. Вось толькі невядома, дзе будзе праходзіць гэта мяжа. І калі яна будзе вызначацца: да пачатку цэнтралізаванага тэсціравання або пасля праверкі экзаменацыйных работ усіх удзельнікаў тэсціравання? Хутчэй за ўсё, на розных дысцыплінах будзе вызначана свая мяжа...

— Мне б хацелася даць параду і выпускнікам, і настаўнікам. Памятайце, што сярэдні бал ЦТ не з'яўляецца пунктам адліку, калі размова ідзе пра ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў. Гэта не той выпадак, калі нейкая сярэдняя лічба характарызуе якасны склад прэтэндэнтаў на бюджэтныя месцы, — падкрэслівае Мікалай Фяськоў. — Пры неаднародным складзе тых, хто праходзіць тэст, сярэдні бал не вызначае ўзроўню падрыхтоўкі як тых, хто знаходзіцца ў ніжняй частцы рэйтынгавага спіса, так і лідараў. Аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання 2011 года паказвае, што сярэдні бал абітурыентаў, залічаных на дзённыя аддзяленні вышэйшых навучальных устаноў за кошт сродкаў бюджэту, высокі. Па абсалютнай большасці прадметаў ён у два разы вышэйшы за сярэдні бал па гэтых дысцыплінах усяго кантынгенту ўдзельнікаў ЦТ, а ў тых, хто паступіў на прэстыжныя спецыяльнасці, — у тры-чатыры разы. Гэта сведчыць пра добры якасны склад студэнцкай аўдыторыі па ўказаных спецыяльнасцях.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў паспрабавалі даследаваць уплыў дадатковай падрыхтоўкі выпускнікоў сярэдніх школ 2011 года на вынікі ўступных іспытаў і выявілі наступную іерархію яе формаў. Вынікі тэсціравання абітурыентаў, якія наведвалі індывідуальныя заняткі з педагогамі, мелі найбольшыя станоўчыя адхіленні ад сярэдніх значэнняў. Па матэматыцы, напрыклад, іх сярэдні бал быў вышэйшы за агульны сярэдні бал на 8,69, а па рускай мове — на 11,02 бала. Тыя з абітурыентаў, хто аддаў перавагу факультатыўным заняткам, значна ўступілі па выніках тэсціравання першым. Адхіленні па пэўных прадметах хоць і станоўчыя, аднак не такія істотныя: 21,79 бала — па рускай мове і 4,04 бала — па беларускай. І зусім нязначнае адхіленне ад сярэдняга значэння (у межах 1 бала) назіралася ў выніках тых паступаючых, хто займаўся на розных падрыхтоўчых курсах пры ВНУ.

Як вядома, у лютым завяршаецца другі тур рэпетыцыйнага тэсціравання. Для павышэння эфектыўнасці ад удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні Мікалай Фяськоў раіць скарыстацца паслугамі рэгіянальнага цэнтра тэсціравання і прафесійнай арыентацыі моладзі пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы. Цэнтр ужо не першы год арганізуе пры падтрымцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў індывідуальныя кансультацыі для ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання. Прычым там могуць пракансультаваць абсалютна любога абітурыента, незалежна ад пункта праходжання рэпетыцыйнага тэсціравання і месца яго жыхарства. Абітурыенту, які заказаў такую завочную кансультацыю (а яе кошт складае ўсяго 14 тысяч рублёў, у той час як удзел у рэпетыцыйным тэсціраванні каштуе 30 тысяч) па пошце ці на электронны адрас дасылаецца пакет вучэбна-метадычных матэрыялаў, дзе аналізуецца кожнае няправільна выкананае заданне. Такім чынам абітурыент атрымлівае не толькі правільныя адказы, указанне на раздзел і нават параграф канкрэтнага падручніка, дзе можна прачытаць тэорыю, але і так званы арыенцір на правільнае выкананне тэставых заданняў — па сутнасці, падрабязны ход рашэння. Маючы такі пакет у сваіх руках, вучань цалкам у стане рыхтавацца далей самастойна і падцягваць тыя тэмы і раздзелы, якія выклікалі цяжкасці на рэпетыцыйным тэсціраванні, а тым больш пры дапамозе бацькоў, школьнага настаўніка ці рэпетытара. Дарэчы, паказчык паспяховасці абітурыентаў, якія скарысталіся індывідуальнай кансультацыяй па выніках усіх трох этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання, намнога вышэйшы на цэнтралізаваным тэсціраванні, чым сярэдні бал па Гродзенскай вобласці...

ЦТ выконвае функцыю таго самага танометра — «высвечвае» ў падрыхтоўцы беларускіх школьнікаў тыя ці іншыя праблемы...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».

Студэнты МІПСА прадставяць Беларусь на конкурсе па міжнародным праве ў Вашынгтоне

Студэнты Міжнароднага ўніверсітэта «МІПСА» прадставяць Беларусь у фінале конкурсу па міжнародным праве імя Філіпа Джэсапа, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе ВНУ.

Каманда МІПСА перамагла ў беларускім нацыянальным раўндзе конкурсу па міжнародным праве імя Філіпа Джэсапа. Гэта значыць, што ў сакавіку 2012 года студэнты ўніверсітэта адправяцца ў Вашынгтон, дзе будуць змагацца за Міжнародны кубак Джэсапа White & Case.

Конкурс імя Філіпа Джэсапа — гэта імітацыя судовага працэсу, у ходзе якога студэнты прадстаўляюць інтарэсы бакоў у выдуманай справе перад Міжнародным судом ААН. У нацыянальным раўндзе каманды-ўдзельніцы пісалі 2 мемарандумы, у якіх абгрунтоўвалі сваю прававую пазіцыю па названых у справе пытаннях — як з боку істца, так і з боку адказчыка. Студэнты таксама выступалі ў вусных раўндах конкурсу перад судовай калегіяй. У кейсе былі закрануты аспекты міжнароднай адказнасці дзяржаў, міжнароднага гуманітарнага права, права міжнародных дагавораў і прававераемства дзяржаў. Па выніках нацыянальнага раўнда «студэнты Міжнароднага ўніверсітэта «МІПСА» не толькі заваявалі галоўны прыз, але і сталі ўладальнікамі ўзнагарод за лепшы мемарандум і лепшаму прамоўцу», — адзначылі ў ВНУ.

Амаль 2 тыс. студэнтаў з больш як 600 юрыдычных ВНУ свету штогод спаборнічаюць у фінале конкурсу па міжнародным праве імя Філіпа Джэсапа. Заснавала яго Міжнародная асацыяцыя студэнтаў-юрыстаў (International Law Students Association). У 2009 годзе прадстаўніцтва ILSA адкрылася на базе Міжнароднага ўніверсітэта «МІПСА». «Мы актыўна падтрымліваем і развіваем палітыку ўдзелу нашых студэнтаў у розных алімпіядах і конкурсах, ствараючы ўсе ўмовы для падрыхтоўкі спецыялістаў міжнароднага ўзроўню», — заявілі ў ВНУ.

ПАПІЎ КРЫВІ...

Пасля размовы з гэтымі людзьмі мы адчуваем сябе так, нібыта толькі што пабывалі ў пральнай машынцы ў якасці бялізны. Сіл зусім няма, пачуццё разбітасці і незадаволенасці тым фактам, што нагадваеш сабой незразумелую шэрую масу, не пакідае да канца дня. А здавалася б, усяго толькі парай слоў перакінуўся, а не мяхі якія цягаў. Калі ўсе сімптомы супадаюць, ёсць верагоднасць, што вы сталі ахвярай энергетычнага вампіра. Яны «харчуюцца» жыццёвымі сіламі навакольных, і часта людзі не ведаюць, як гэтаму супрацьстаяць.

ТЫРАН АД ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

— І хто так працуе! Вось гэтыя швы перарабіць трэба! — чула на свой адрас ледзь не кожны дзень мая знаёмая Юля ад сваёй начальніцы. Дзяўчына адразу пасля вучылішча працавала на швейнай фабрыцы. Жанчына, якой даручылі маладую і «зялёную» спецыялістку кансультаваць і чым можна ёй дапамагаць, была сапраўды добрай швачкай, і першым часам да заўваг яе Юля прыслухоўвалася:

— Спачатку я маўчала, але месяцы праз тры гэтыя прэтэнзіі ўжо здаваліся мне бязглуздымі. Што, я сама не бачу, што нармальна ўсё зроблена? Ды яшчэ і іншыя заўвагі на мой адрас пачаліся: то я «боты такія страшныя купіла», то чаго гэта «сабе пазногці адрасціла, адразу відаць, што гультайка». Карацей, проста жах. Пасля такога я ўжо не магла стрымлівацца і спрачалася, часам нашы спрэчкі пераходзілі ў крык.

Кожны раз пасля такога высвятлення адносін Юля ішла дадому ў жудасным настроі: хацелася плакаць, ногі ледзь слухаліся, а думкі пра наступны дзень, калі зноў трэба ісці на працу, здаваліся невыносімымі. Неяк з раніцы дзяўчына паднялася з ложка і зразумела, што ніяк не можа сябе прымусіць выйсці з дому. І ўсё ж працу прагульваць было нельга. Юля прыйшла, села на сваё месца і ўключыла машынку:

— Хвілін праз пяць з'явілася гэтая жанчына і адразу ж пачала шукаць, да чаго прычапіцца: «Ага, ізноў сёння вочы ледзь адкрываеш? Пасля дыскатэкі не адаспалася, наробіш ужо, адчуваю», — расказвае Юля. — Я не адказала ёй на гэта нічога, хоць звычайна не стрымлівалася. Проста ў гэты раз сіл не было зусім, нават галаву ўзняць.

Жанчына ж ніяк не змаўкала. Зразумеўшы, што рэакцыі не будзе, яна паспрабавала абурыцца:

— Вось ужо і не гаворыш са мной. Усё, забылася, хто працаваць навучыў? Цяпер нос дагары?

Калі і на гэта ніякага адказу не пачула, пусціла ў ход апошні сродак:

— Вось жа, папрысылаюць кікімар такіх, а ты важдайся з імі!

Нават пасля гэтага шквалу эмоцый не атрымаўшы, жанчына, крыху расчараваная, адвярнулася і пайшла.

Юля радавалася нечаканаму адкрыццю:

— Я зразумела, што не казаць ёй наогул нічога — найлепшы для мяне варыянт. Тэрмін яе нада мной «апекі» ўжо заканчваўся, але нават тыя апошнія дні яна мяне больш не турбавала.

АБНЯЦЬ І ПЛАКАЦЬ

— З Вадзікам мы бачымся толькі на дні народзін нашай агульнай сяброўкі, чаму я неверагодна рада, — жартуе Марыя, студэнтка аднаго са сталічных універсітэтаў.

Гэты загадкавы Вадзік — не былы Машын хлопец, не яе вораг, і грошай Маша яму таксама не павінна. Вадзік, калі можна так сказаць, прафесійны песіміст.

Любая размова з ім ператвараецца для Марыі ці то ў псіхалагічную кансультацыю, ці то ў споведзь:

— Пяць хвілін ў яго прысутнасці, і я пачынаю адчуваць, які свет жудасны і як мне не шанцуе. А галоўнае — з мяне сілы проста сыходзяць, калі гэты чалавек побач. Расказвае ён, як пакутуе ад бессардэчнага суседа па пакоі, ці якая яго апошняя дзяўчына аказалася каварная, шкадуе сябе, беднага, ледзь не плача, а я сама разумею, што яшчэ пяць хвілін — і сама пачну размазваць слёзы па шчоках.

Яшчэ Вадзік — страшэнны панікёр. Любая дробная жыццёвая непрыемнасць прымушае яго прыдумваць жудасны сцэнар, па якім пасля гэтага пачне развівацца яго жыццё:

— Вось ён прыдумае нешта, і сам у гэта паверыць. Пачынае размаўляць са мной — нібыта хоча, каб сказалі, што ўсё добра будзе, але ж як яго пераканаць, калі ён верыць зусім не настроены, а настроены толькі ніць далей.

Пара хвілін у ролі слухача адбірае ўсё жаданне жыць, і чым больш Маша Вадзіка шкадуе, тым горш ёй самой. І пазбягаць размовы нібыта некультурна, не скажаш жа «вампір, ідзі адсюль», але ж і сілкаваць кагосьці сваёй энергіяй — таксама не варыянт.

КАБ НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ

Як відаць, энергетычныя вампіры бяруцца не з нейкіх казачных рэальнасцяў. Псіхолагі тлумачаць з'яўленне такіх вось «таварышаў» прабеламі ў іх выхаванні. Ёсць вампіры-агрэсары, як жанчына з першага прыкладу. Яны атрымліваюць ад вас патрэбную порцыю энергіі, ствараючы канфлікт. Як толькі вы паддаліся і ледзь павысілі голас — лічыце, падарылі свае сілы. Вампіры-агрэсары ў дзяцінстве — звычайна дзеці, якім не хапае ўвагі. З сям'і, дзе бацькі вельмі занятыя. Занятыя настолькі, што найбольшы эмацыйны кантакт з дзіцем — пакаранне за сапсаваную рэч ці яшчэ за нешта, на што проста нельга не адрэагаваць. Малы хутка разумее, што шкодай выклікае ў бацькоў цікавасць да сваёй асобы, і ў далейшае жыццё пераносіць такі метад стасункаў з навакольнымі.

Вампіры, якія імкнуцца выклікаць жаль і спачуванне. Гэтым якраз увагі хапала. Магчыма, яны часта ў дзяцінстве хварэлі, і клапатлівая матуля хворам будучаму вампіру ні ў чым не адмаўляла. Хочаш — шакалад у неабмежаванай колькасці, хочаш — масаж пятак. Хвароба вечна не доўжыцца, а таму па яе заканчэнні дзіця разумее, што ў звычайным стане шакалад можна толькі пасля абеду і патроху. Чаму б не прыкінуцца хворым, няшчасным, не папрасіць пашкадаваць? Досыць зручны спосаб атрымліваць жаданае.

Як жа супрацьстаяць энергетычнаму вампірызму? Галоўная зброя супраць гэтага — не завостраны асінавы калок і не вянок часнаку, а ўменне правільна і без страт выйсці з размовы, якую вампір намагаецца з вамі завязаць.

1 СПОСАБ НАЗЫВАЕЦЦА «СІНІ АЎТОБУС». Калі непрыемны вам чалавек імкнецца навязаць размову ці канфлікт, пачніце задаваць пытанні не па тэме. «Як завуць твайго ката? Шапэнгаўэр — гэта выпадкова не гатунак сыру? А сіні аўтобус прыгажэйшы за чырвоны?» Чым больш інтэнсіўна будзеце цікавіцца, тым хутчэй вампір ад вас адчэпіцца, бо пабачыць, што вы правілы яго «гульні» не падтрымліваеце.

2 СПОСАБ «АНАЛІЗУЙ ГЭТА». Калі размову скончыць не атрымліваецца, знайдзіце ў закутках сваёй памяці любы эпізод. Пасля гэтага для ўласнай бяспекі трэба толькі ківаць галавой і ў дэталях, са шматузроўневымі высновамі, узнаўляць у думках абраны жыццёвы момант, не адрываючыся на слуханне таго, што расказваюць.

3 СПОСАБ «ТЭЛЕФОН-РАТАВАЛЬНІК». Запомніце два выразы: «Прабач, мне тэлефануюць», «Я ж і забыўся, мне трэба зрабіць адзін званок». І выкарыстоўвайце іх адразу, як толькі адчуваеце патрэбу стасункі перарваць.

4 СПОСАБ «КЛІН КЛІНАМ». Для тых, хто можа адрозніць вампіра-агрэсара ад вампіра-пакутніка, падыдзе такі метад. Зразумеўшы, чаго ад вас чалавек чакае, пачніце рэагаваць зусім адваротна. Просіць паспачуваць — пакрытыкуйце яго за што-небудзь, намагаецца вас раззлаваць — усміхайцеся ва ўвесь рот і скажыце, як ён добра сёння выглядае.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Конкурс

Прафесія выратавальніка ў дзіцячых малюнках і вершах

З 15 па 17 лютага ў Палацы культуры горада Маладзечна будзе праходзіць абласная выстава «Выратавальнікі вачыма дзяцей», якую змогуць наведаць усе, хто хоча атрымаць уяўленне пра тое, якой бачыць прафесію выратавальніка падрастаючае пакаленне.

Сёлета на абласны конкурс будуць прадстаўлены творы-пераможцы раённых тураў па 9 намінацыях: «малюнак», «плакат», «дробная праца», «мадэль пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі», «статуэтка», «талісман рэспубліканскага злёту юных выратавальнікаў-пажарных», «казка», «апавяданне», «верш». 17 лютага адбудзецца ўзнагароджванне самых таленавітых і творчых дзетак. У працяг гэтай цырыманіі запланавана падвядзенне вынікаў працы Мінскага абласнога аддзялення Беларускай моладзевай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных «Разам у бяспечную будучыню».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГАЙДА Ў ЯМАЛ?

Як вядома, трэба сані рыхтаваць летам, а рыхтавацца паехаць папрацаваць у складзе моладзевых атрадаў летам, аказваецца, можна зімой.

Віцебская гарадская арганізацыя «БРСМ» ужо запрашае дзяўчат і юнакоў знайсці сабе часовую работу на працягу трэцяга працоўнага семестра. У вольны ад вучобы і асноўнай працы час магчымыя варыянты працаўладкавання як у Беларусі (у будаўнічых, сельскагаспадарчых, педагагічных і іншых атрадах), так і за мяжой. У прыватнасці, прапануецца праца ў сэрвісных атрадах на Чарнаморскім узбярэжжы Краснадарскага края Расіі, таксама патрабуюцца праваднікі чыгуначнага транспарту. Чакаюць беларускую моладзь на сельскагаспадарчых работах у Маскоўскай вобласці, на новабудоўлях у Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе...

Віцебскі гарадскі камітэт «БРСМ» запрашае да супрацоўніцтва працадаўцаў усіх формаў уласнасці з прапановамі па працаўладкаванні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка, в отношении которого предполагается заключить договор аренды. Функциональное назначение земельного участка, срок аренды.	Возможность подведения инженерных коммуникаций. Ограничения использования земель.	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения
1	Земельный участок с кадастровым номером 240155400001000393, площадью 0,0012 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, г.п. Руба под строительство объекта «Торговый киоск в составе остановочного комплекса по улице Центральной в городском поселке Руба, остановка «Заводоуправление». Срок аренды – 5 лет.	Возможность подключения электроснабжения, доступ улиц с твердым покрытием. Ограничений в использовании нет.	249 496	49 890 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком

Дата, время и место проведения аукциона – 19.03.2012 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Прием документов начинается 15.02.2012 в 8.30 и заканчивается 13.03.2012 в 17.30.

Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона оплатить предмет аукциона в порядке, указанном в протоколе аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона (информация о затратах, по каждому объекту (лоту), выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала аукциона); подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 2-х рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнений условий, указанных в протоколе аукциона, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка; осуществить государственную регистрацию в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 3 (три) месяца; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; произвести благоустройства прилегающей территории на земельном участке площадью 0,0047 га; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии (формировании) земельного участка для проведения аукциона.

Инженерные коммуникации и сооружения на земельных участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

1. **Для участия в аукционе** приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица. Гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо должны представить документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка; подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;
- для индивидуальных предпринимателей – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- для представителей гражданина и индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем.

2. Всем участникам предоставляется право ознакомления с материалами землеустроительного дела и решением об изъятии (формировании) земельного участка для проведения аукциона, а также возможность осмотра земельного участка.

3. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

4. Контактный тел.: (0212) 42 61 62, e-mail: vcm74@mail.ru, **www.marketvit.by.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч. Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ. Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А. Кантактны тэлефон: 292 44 12. e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by. Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 30.015. Нумар падпісаны ў 19.30 14.02.2012 г.

ОТЧЕТ ОБ ИСПОЛЬЗОВАНИИ ИМУЩЕСТВА

Местного добровольно-общественного благотворительного фонда Фрунзенского района г. Минска «Правопорядок»

Учредитель фонда: Общественное объединение «Правопорядок» и Супранович Анатолий Петрович.

220093, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 57.

Остаток денежных средств на начало года — 9 249 969 Br.

Поступило денежных средств всего — 499 700 566 Br.

Доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом предпринимательской деятельности, — 496 700 566 Br.;

прочие поступления — нет;

добровольные взносы и пожертвования юридических и физических лиц — 3 000 000.

Суммы расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей и расчетов с бюджетом и внебюджетными фондами, — 479 712 302 Br.

Остаток денежных средств на 31.12.2011 г. — 19 988 264 Br.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

Ответ утвержден правлением фонда 02 января 2012 года.

Согласован с попечительским советом фонда 02 февраля 2012 года.

УНП 194901329

Незамкнутая ячэйка — спакуса для злодзея

У Віцебску з камеры захоўвання ў краме ў пакупніка скралі ноўтбук і зарадную прыладу да яго.

Вечарам у Чыгуначны РАУС звярнуўся студэнт, жыхар горада Горкі, які расказаў, што нехта з незамкнутай ячэйкі камеры захоўвання крамы на вуліцы Кірава (ля чыгуначнага вакзала — **А.П.**) здзейсніў крадзеж сумкі, у якой знаходзіліся ноўтбук і зарадная прылада да яго. Шкоду ацанілі на суму 7,5 мільёна рублёў.

Міліцыянеры затрымалі злодзея — грамадзяніна без пэўнага месца жыхарства. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АТЭСТАЦЫЯ ПЕДАГОГАЎ СТАНОВІЦЦА АБАВЯЗКАМ

Педагогам з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй давядзецца пацвярджаць свой статус кожныя пяць гадоў

ПРЫСВАЕННЕ настаўніку вышэйшай катэгорыі не павінна быць «пажыццёвай узнагародай». Такую думку агучыў летась на пленуме ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО. «Сёння вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыі маюць 74,6 працэнта ад агульнай колькасці педагагічных работнікаў. Але ці ўсе яны адпавядаюць высокай кваліфікацыі? Ці не разбэсціла наяўнасць вышэйшай катэгорыі педагогаў у плане арганізацыі якаснай работы?» — задаваў зусім не рытарычныя пытанні Казімір Фарыно.

На выніковай калегіі свайго ведамства міністр адукацыі Сяргей Маскевіч заявіў, што павінны быць установлены больш высокія патрабаванні да ацэньвання прафесійнай кампетэнцыі педагогаў. У сувязі з гэтым будзе падрыхтавана новая рэдакцыя Палажэння аб атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Рабочы праект Інструкцыі аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу ВНУ) на прысваенне ім кваліфікацыйных катэгорый ужо ёсць, і мы з ім азнаёмленыя. Аднак не з усімі пазіцыямі мы былі згодны, таму нашы прапановы і былі адрасаваны сацыяльнаму партнёру — Міністэрству адукацыі, якое паставілася да іх з належнай увагай, — расказаў журналісту «Звязды» **намеснік старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА.** — Раней атэстацыя была правам педагога, а не яго абавязкам. І калі педагог жадаў павысіць сваю катэгорыю, каб атрымліваць адпаведную надбаўку, ён гэта рабіў. Цяпер, у адпаведнасці з артыкулам 53 Кодэкса аб адукацыі, педагагічныя работнікі абавязаны павышаць свой прафесійны ўзровень і праходзіць атэстацыю, гэта значыць, праходжанне атэстацыі перайшло з катэгорыі правоў у катэгорыю абавязкаў. Але тут ужо узнікае шэраг пытанняў. І мы настойваем на тым, каб усе нюансы знайшлі адлюстраванне ў Інструкцыі аб атэстацыі.

Фактычна мяркуецца, што будуць суіснаваць два віды атэстацыі: першы — на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі, які існаваў раней, — застанецца правам педагога. А вось другі від — на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі раз на пяць гадоў — будзе ўжо абавязкам. Але калі педагагічны работнік у абавязковым парадку павінен пацвярджаць кваліфікацыйную катэгорыю, то памер даплаты за яе павінен стымуляваць педагога да павышэння свайго прафесійнага ўзроўню і прысваення яму больш высокай кваліфікацыйнай катэгорыі. А на сённяшні дзень даплаты маюць хутчэй сімвалічны, чым заахвочвальны характар. У студзені ў настаўнікаў і выхавальнікаў з вышэйшай адукацыяй даплата за другую кваліфікацыйную катэгорыю складала 126 тысяч 768 рублёў, за першую — 171 тысячу 600 рублёў і за вышэйшую — 263 тысячы рублёў. Як бачна, розніца ў памерах даплат за першую, другую і вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю — мінімальная. Мы лічым, што калі да атэстацыі прад'яўляюцца больш высокія патрабаванні, то павінны быць прадугледжаны кампенсацыйныя захады ў выглядзе значнага павышэння памераў надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі.

Далей: пры атрыманні вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, згодна з праектам інструкцыі, прадугледжваецца абавязковы кваліфікацыйны экзамен, хоць раней педагагічныя работнікі са стажам працы на пасадзе 10 і больш гадоў мелі права прэтэндаваць на вышэйшую катэгорыю ўвогуле без здачы кваліфікацыйнага экзамену. І, чаго хаваць, часам да пытання атэстацыі педагогаў падыходзілі на месцах выключна фармальна. Тым больш не сакрэт, што ў сістэме адукацыі з кожным годам павялічваецца колькасць настаўнікаў-пенсіянераў і змяншаецца колькасць настаўнікаў іншых узростаў. Таму кожны год мы фіксавалі прырост педагогаў з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй, і праз некалькі гадоў маглі б мець ужо і 50, і 60 працэнтаў педагогаў вышэйшай кваліфікацыі. Наколькі гэта правільна — пытанне хутчэй да педагагічнай навукі, але пытанне, як кажуць, ёсць. Таму ўвядзенне кваліфікацыйнага экзамену пры атрыманні вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі не пазбаўлена сэнсу. Аднак як і дзе будзе праходзіць гэты экзамен?

Раней кваліфікацыйныя экзамены прымаліся на базе адпаведных рэспубліканскіх установ, найперш Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, а таксама рэгіянальных — абласных і Мінскага гарадскога інстытутаў развіцця адукацыі. Сёння дыскусія сканцэнтравалася на тым, а ці правільна, што экзамен на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю будзе прымацца толькі рэспубліканскімі камісіямі? Трэба мець на ўвазе, што ў нас адсутнічае адзіная сістэма арганізацыі кампенсацыйнага навучання педагагічных работнікаў ва ўстановы, дзе праводзяцца кваліфікацыйныя экзамены. І толькі ў некаторых выпадках такое камандзіраванне аплачваецца. Бываюць выпадкі, калі для кампенсацыі камандзіровачных выдаткаў ва ўстановах адукацыі прыбягаюць да стымулюючых выплат, але часцей за ўсё такія выдаткі кладуцца непасрэдна на педагагічных работнікаў. Звычайна кваліфікацыйны экзамен разглядаўся ў кантэксце планавага павышэння кваліфікацыі на базе адпаведнай установы.

«Увядзенне звання ці кваліфікацыйнай катэгорыі настаўніка-метадыста стане дадатковым стымулам для таго, каб настаўнік павышаў сваё педагагічнае майстэрства і сваю кваліфікацыю»

Пагадзіцеся: адна справа, калі здаць экзамен у Акадэміі трэба мінчаніну, і зусім іншая — калі ў атрыманні вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі зацікаўлены настаўнік, напрыклад, з аддаленых сельскіх школ Гомельшчыны або Брэстчыны. Яму для гэтага трэба будзе ехаць у Мінск? Распрацоўшчыкі інструкцыі тлумачаць, што Акадэмія паслядыпломнай адукацыі будзе толькі базай для фарміравання складу камісіі для прыняцця ў педагогаў кваліфікацыйнага экзамену, а не месцам яго правядзення. І гэтая камісія будзе выязджаць непасрэдна ў рэгіёны.

Калі гэта так, то ўсё павінна быць падрабязна прапісана ў інструкцыі, павінны быць дакладна вызначаны крыніцы фінансавання як на выпадак камандзіравання педагагічнага работніка, які здае кваліфікацыйны экзамен, так і на выпадак камандзіравання членаў камісіі. Трэба мець на ўвазе, што члены камісій — таксама работнікі ўстаноў адукацыі і іншых арганізацый, таму трэба прапрацоўваць гэтае пытанне і з іх наймальнікамі. Для нас гэтыя пытанні вельмі важныя...

— Але першапачаткова меркавалася, што і першую, і другую кваліфікацыйную катэгорыі таксама давядзецца пацвярджаць...

— Аўтары гэтай ідэі кіраваліся агульнымі падыходамі да правядзення атэстацыі на адпаведнасць займанай пасадзе, але мы маем справу з зусім іншым відам атэстацыі. Таму прафсаюз з такой пазіцыяй быў катэгарычна не згодны, бо ўвядзенне абавязковага пацвярджання другой і першай кваліфікацыйных катэгорый стала б значным пагаршэннем прававога становішча педагагічных работнікаў.

Тым больш што праектам інструкцыі прадугледжана права кіраўніка ўстановы адукацыі праводзіць адзін раз на пяць гадоў абавязковую атэстацыю педагагічных работнікаў, якія знізілі ўзровень сваёй работы, аб чым сведчаць вынікі іх педагагічнай дзейнасці за гэты перыяд, і педагагічных работнікаў, якія мелі перапынак у працы на педагагічных пасадах больш чым два гады. Гэта значыць, што кваліфікацыйную катэгорыю педагога могуць знізіць. Але для рэалізацыі гэтага пункта патрабуецца распрацоўка канкрэтных, абсалютна празрыстых і зразумелых усім крытэрыяў зніжэння вынікаў педагагічнай дзейнасці.

«...кваліфікацыйную катэгорыю педагога могуць знізіць. Але для рэалізацыі гэтага пункта патрабуецца распрацоўка канкрэтных, абсалютна празрыстых і зразумелых усім крытэрыяў зніжэння вынікаў педагагічнай дзейнасці»

Лічым таксама неабходным захаваць мадэль арганізацыі дзейнасці атэстацыйных камісій на базе ўстаноў адукацыі, дзе працуюць адпаведныя педагагічныя работнікі. Гэта дазволіць якасна супаставіць атэстацыйныя матэрыялы з рэальнымі вынікамі педагагічнай дзейнасці з улікам меркавання калектыву і прафсаюзнай арганізацыі.

А пры пацвярджэнні вышэйшай катэгорыі ў якасці формы атэстацыі пакінуць абарону ўласнага педагагічнага досведу на базе ўстаноў адукацыі, дзе працуе адпаведны педагагічны работнік.

— Раман Восіпавіч, магчыма, я памыляюся, але мне здаецца, што і раней у наймальнікаў было права паставіць пад сумненне кваліфікацыйную катэгорыю педагагічнага работніка?

— Тэарэтычна такая магчымасць была, але на практыцы ёй не карысталіся, ва ўсялякім разе я не магу прыгадаць за апошнія 10 гадоў хоць адзін выпадак, калі б педагогу знізілі катэгорыю. Менавіта таму мы і настойваем на распрацоўцы канкрэтных крытэрыяў зніжэння вынікаў педагагічнай дзейнасці, калі ўжо ўвядзенне такой нормы лічыцца неабходным. Да таго ж, каб не дапусціць неадназначнасць трактоўкі наймальнікамі вынікаў атэстацыі, мы прапануем занатаваць у інструкцыі чатыры варыянты рашэнняў, якія могуць быць прынятыя па выніках атэстацыі. Першы — прысвоіць педагогу адпаведную кваліфікацыйную катэгорыю. Другі — не прысвоіць адпаведную кваліфікацыйную катэгорыю, пацвердзіўшы кваліфікацыйную катэгорыю, якая была прысвоена раней. Трэці — пацвердзіць кваліфікацыйную катэгорыю, якая была прысвоена раней. І апошні — знізіць кваліфікацыйную катэгорыю, якая была прысвоена раней, прысвоіўшы адпаведную кваліфікацыйную катэгорыю, гэта значыць прысвоіць першую ці другую кваліфікацыйную катэгорыю. Зразумела, знізіць другую катэгорыю немагчыма, бо такая працэдура кваліфікавалася б як пазбаўленне кваліфікацыйнай катэгорыі.

— На апошняй калегіі Міністэрства адукацыі агучваўся таксама намер увесці кваліфікацыйную катэгорыю настаўніка-метадыста...

— Увядзенне звання ці кваліфікацыйнай катэгорыі настаўніка-метадыста стане дадатковым стымулам для таго, каб настаўнік павышаў сваё педагагічнае майстэрства і сваю кваліфікацыю. Гэта будзе яшчэ адна прыступка, на якую зможа ўзняцца таленавіты настаўнік. Справа ў тым, што кар'ерная лесвіца ў педагогіцы не вельмі доўгая. Не ўсе ж педагогі хочуць займацца кіраўніцкай дзейнасцю: працаваць дырэктарамі ўстаноў адукацыі, іх намеснікамі, пераходзіць на работу ў аддзелы і ўпраўленні адукацыі. Творчаму педагогу месца, напэўна, побач з дзецьмі ў школе. Але такая работа павінна годна ацэньвацца і, адпаведна, годна аплачвацца. Гэта значыць, мы павінны стварыць сітуацыю, каб настаўніку было куды расці.

Мяркую, што з'яўленне звання ці кваліфікацыйнай катэгорыі настаўніка-метадыста дазволіць нам вырашыць шэраг пытанняў, у тым ліку ўкамплектаваць нашы метадычныя службы больш кваліфікаванымі кадрамі. Упэўнены, што на такое званне павінны прэтэндаваць найперш педагогі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. Прычым прэтэндэнт павінен быць не толькі адораным педагогам, але ён павінен быць таксама гатовым і здольным трансляваць свой досвед калегам. Атрыманне гэтага звання павінна накладаць як адпаведныя абавязкі на работніка, так і даваць яму пэўныя гарантыі. Напрыклад, істотная надбаўка за катэгорыю настаўніка-метадыста павінна захоўвацца за педагогам пры пераходзе педагога з адной установы адукацыі ў іншую, незалежна ад яе ступені, а таксама на адміністрацыйную работу, у тую ж метадычную службу.

Нізкі сацыяльны статус прадстаўнікоў метадычнай службы на сённяшні дзень абсалютна не адпавядае іх рэальнай важнасці для галіны, хоць і якасць адукацыі, і метадычнае суправаджэнне адукацыйнага працэсу, і атэстацыя педагагічных работнікаў наўпрост звязаны з работай спецыялістаў метадычных службаў. Гэта парадокс, але пасады метадыстаў замест вопытных педагогаў з багатай практыкай у некаторых выпадках пачынаюць займаць ужо маладыя спецыялісты. Прычым гэта адбываецца ў розных рэгіёнах. Але гэта ні ў якім выпадку не павінна разглядацца як падстава для перагляду неабходнасці існавання самой метадычнай службы.

— Раман Восіпавіч, але не ва ўсіх работнікаў сістэмы адукацыі сёння ёсць магчымасць атрымаць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Што будзе з імі?

— Сапраўды, не маглі да апошняга часу атрымаць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, напрыклад, настаўнікі фізічнага выхавання, але на ўзроўні праекта гэтае пытанне ўжо вырашана. Праблематычна атрымаць кваліфікацыйную катэгорыю многім работнікам у сістэмах дадатковай і дашкольнай адукацыі. Гэта звязана з тым, што ў гэтых сферах працуе шмат людзей без профільнай педагагічнай адукацыі. У тых жа дзіцячых садках сёння працуюць выхавальнікамі спецыялісты з рознай адукацыяй, у тым ліку з юрыдычнай, эканамічнай і г.д. Гурткі і аб'яднанні па інтарэсах у дзяцей вядуць спецыялісты з тэхнічнай, мастацкай, музычнай адукацыяй і гэтак далей. Мабыць, не ўсе пытанні ў гэтай частцы можна вырашыць з дапамогай сістэмы перападрыхтоўкі, тым больш, што праца ў сістэме дадатковай адукацыі не заўсёды стабільная. Раней ці пазней гэтыя праблемы таксама давядзецца вырашаць. Мяркую, што выйсце маглі б падказаць наймальнікі. Прафсаюз да такіх прапаноў заўсёды адкрыты.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАГЭТА ГАВОРАЦЬ

У Слаўгарадзе

СПАРТЫЎНАЕ ДЗЯЦІНСТВА

У Слаўгарадзе пасля капітальнага рамонту адкрылася дзіцячая юнацкая спартыўная школа. Рамонтныя работы доўжыліся паўтара года і каштавалі 1,5 мільярда рублёў. Сродкі выдаткавалі не толькі на рамонт, але і на абсталяванне, спартыўны інвентар.

Юныя спартсмены і іх настаўнікі гавораць, што цяпер у школе ёсць усе ўмовы для трэніровак. Асабліва рады адкрыццю абноўленай спартыўнай школы ў футбольным клубе «Слаўгарад», гульцам якога даводзілася трэніравацца ў суседнім аграгарадку, каб не страціць форму.

У хуткім часе плануецца пабудаваць у гэтым раённым цэнтры сучасны фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

Ілона ІВАНОВА.

У Мінску

ЧАМУ ХОЛАДНА Ў ТРАНСПАРЦЕ?

Пасажыры сталічнага наземнага транспарту падчас халадоў скардзяцца, што ў аўтобусах і тралейбусах невыносна холадна. Шмат дзе эфект ад печак, якія ёсць у салоне, амаль незаўважны, таму людзям толькі і застаецца, што спрабаваць працерці рукавіцай заледзянелае шкло, рызыкуючы прымерзнуць да сядзення. Няўжо нельга вырашыць гэтую праблему?

Як патлумачыў першы намеснік дырэктара, галоўны інжынер мінскага аўтапарка №2 Ігар Журок, у наземным транспарце ёсць некалькі прыстасаванняў для абагрэву. Гэта спецыяльныя канвектары, якія павінны працаваць пастаянна, дадатковыя печкі, а таксама адмысловая ацяпляльная сістэма. Калі на вуліцы -15 і ніжэй, вадзіцелю належыць трымаць уключанымі ўсе гэтыя прыстасаванні на працягу ўсяго часу руху.

Цікаўлюся, ці магчыма выкарыстоўваць нейкія дадатковыя спосабы зрабіць грамадскі транспарт больш цёплым. Напрыклад, падумаць пра дадатковую герметызацыю вокнаў ці дзвярэй:

— Нават калі гэта зрабіць, то эфект не будзе адчувальным. Аўтобус пад'язджае да прыпынку кожныя 5-10 хвілін, дзверы адчыняюцца. Пры амаль -30 на вуліцы ў салоне ніяк нельга зрабіць +18, — гаворыць Ігар Журок. — На холад у транспарце нам скардзяцца пастаянна. Ёсць нядобрасумленныя вадзіцелі, якія не ўключаюць поўнасцю сістэму ацяплення, хочуць зэканоміць паліва, але мы можам на адлегласці гэта кантраляваць з дапамогай спецыяльнай праграмы. Таму з такой праявай пасажыры наўрад ці сустрэнуцца.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

У Віцебску

АСАБІСТЫ... ДЭРМАТАВЕНЕРОЛАГ

У Віцебскім абласным скурна-венерычным дыспансеры ўсе ахвотныя могуць займець асабістага доктара. Навінка ўжо карыстаецца попытам.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **Віктар Спірыдонаў, галоўны ўрач Віцебскага абласнога скурна-венерычнага дыспансера,** мэта «ноу-хау» індывідуальны падыход у лячэнні. Зразумела, паслуга платная, але параўнальна недарагая — каля 600 тысяч рублёў на год. За гэтыя грошы правядуць усе патрэбныя даследаванні, у аплату ўваходзіць і комплекс неабходных працэдур. Таксама магчыма і правядзенне рэабілітацыйных мерапрыемстваў. Цікава, што пацыент можа, калі спатрэбіцца, тэлефанаваць непасрэдна «свайму» лекару. Больш за тое, пры неабходнасці доктар можа наведаць пацыента дома. Аплаціўшы паслугі за год, пацыент будзе карыстацца паслугамі асабістага венеролага без абмежаванняў па колькасці зваротаў і дадатковых даплат. Дзякуючы пастаяннаму назіранню, урач зможа падабраць для пацыента найбольш эфектыўнае і комплекснае лячэнне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТАНЦУЕМ ПА-БЕЛАРУСКУ

У Магілёве прайшоў майстар-клас, прысвечаны беларускім народным танцам. У абласным Палацы культуры з дапамогай спецыялістаў усе зацікаўленыя вучыліся танцаваць кадрылю, польку і падыспань. Людзей было нямала: некалькі дзясяткаў пар розных узростаў, у тым ліку і моладзь.

Калі раней было модна ў пошуках сваіх каранёў звяртацца да рыцарства, то цяпер маладыя людзі сталі актыўна цікавіцца вясковай культурай: звычкамі, традыцыямі, песнямі і танцамі. Прынамсі, зварот грамадства да фальклору — гэта добры знак, лічаць прыхільнікі нацыянальнай культуры.

Алена КАЗЛОВА.

21 марта 2012 года в 12.00
СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «НеоТрейдЗапад»

Собрание будет проходить по адресу: г. Гродно, пер. Дзержинского, 17.

Начало регистрации участников собрания – 11.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1) Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основные направления деятельности Общества в 2012 году.
2) Отчет Наблюдательного совета Общества.
3) Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчетов о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
4) О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2011 год.
5) Утверждение основных направлений использования прибыли в 2012 и в первом квартале 2013 года.
6) Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
7) О материальном вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8) О сделках Общества.

УНП 500167057

ОАО «Автомагистраль» (г. Минск, ул. Кижеватова, 8)
извещает своих акционеров о проведении 22.03.2012 в 15.00 очередного общего собрания акционеров по адресу:
г. Минск, ул. Кижеватова, 8, зал заседаний (каб. 222).
Форма проведения собрания: очная.

Повестка дня собрания:

1. Об итогах деятельности Общества за 2011 год и Бизнес-плане развития ОАО «Автомагистраль» на 2012 год.
2. О работе наблюдательного совета ОАО «Автомагистраль» в 2011 году.
3. Утверждение заключения ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2011 год, распределение прибыли и убытков в 2012 году.
5. О размерах начисления дивидендов за 2011 год, их утверждение, сроках выплаты.
6. Установление вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Об утверждении изменений в Устав ОАО «Автомагистраль».

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания: г. Минск, ул. Кижеватова, 8, каб. 211, 212 — в период с 12.03.2012 по 21.03.2012 с 14.00 до 16.00 (кроме пятницы, субботы, воскресенья), а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет производиться с 13.00 до 14.00 в день по месту проведения собрания по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера — доверенность). Лица, не прошедшие регистрацию, не вправе принимать участие в голосовании.

Список акционеров ОАО «Автомагистраль», имеющих право на участие в собрании, составлен по состоянию на 01.03.2012 на основании данных реестра акционеров.

УНП 100120075

ОАО «МИНСКТОРГАВТОТРАНС»
извещает своих акционеров о проведении 22 марта 2012 г. очередного общего собрания акционеров, которое состоится по адресу: г. Минск, пер. Солтыса, 5, Грузовой автомобильный парк № 3 ОАО «Минскторгавтотранс» (актовый зал).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и о задачах на 2012 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2011 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибыли и убытках за 2011 г.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли, полученной в 2011 году и на 2012 г.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало собрания в 16.00. Регистрация участников с 15.20 до 15.50 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

С материалами по вопросам повестки дня можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 30 в рабочие дни с 9.00 до 16.30, начиная с 14 по 21 марта 2012 г., либо 22 марта 2012 г. по месту проведения собрания.

УНП 100217272

Уважаемые акционеры ОАО «МинскСортСемОвощ»!
29 марта 2012 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «МинскСортСемОвощ»

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основных направлениях его развития в 2012 году.
2. Отчет наблюдательного совета Общества о работе в 2011 году.
3. О заключении ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового бухгалтерского отчета, баланса, отчета о прибылях и убытках Общества, распределения чистой прибыли за 2011 год и направлений использования чистой прибыли в 2012 году. Выплата дивидендов за 2011 год.
5. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
6. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Об оказании спонсорской помощи семенами и другими ресурсами общественным организациям инвалидов, детским приютам, больницам в 2011 году и утверждении ее суммы на 2012 год.

Место проведения собрания: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1 (актовый зал).

Начало собрания: 9 часов 00 минут.

Время регистрации участников — в день проведения собрания с 8 часов 30 минут до 8 часов 55 минут по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 16 февраля 2012 года.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров — по паспорту и доверенности.

Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ»

УНП 600052664

Крупицкий сельский исполнительный комитет проводит тендер по покупке автомобиля марки «Chevrolet NIVA», тел. моб. 8 029 339 69 10.

УНП 600052399

РАСІЙСКІЯ ГІПЕРМАРКЕТЫ ХОЧУЦЬ ПРАДАВАЦЬ БЕЛАРУСКАЕ. Але ці гатовы нашы вытворцы?

Беларускія вытворцы прадуктаў харчавання і маркетолагі сур'ёзна задумваюцца над тым, як увайсці ў гандлёвыя сеткі суседняй Расіі — рабіць гэта паасобку або аб'яднацца для дасягнення сінэргетычнага эфекту? Напрыклад, Анатоль АКАНЦІНАЎ, генеральны дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы», лічыць, што вытворцам разам з маркетолагамі і іншымі зацікаўленымі арганізацыямі наспеў час стварыць праект «Беларускія прадукты харчавання» і такім чынам разам прасоўваць нашу беларускую прадукцыю на замежныя рынкі:

— Беларускім вытворцам паасобку вельмі складана прабіцца на расійскі рынак, бо яны маюць невялікія магутнасці, магчыма, нестае некаторага прафесіяналізму. Таму ўзнікла патрэба кансалідацыі сіл, каб рэалізаваць сумесныя праекты. Але пытанне, якой будзе гэтая кансалідацыя — па галіновым прынцыпе, па лагістычным, па брэндавым — сёння застаецца адкрытым.

Анатоль Аканцінаў патлумачыў, што пэўная праца, вядома, ужо вядзецца і канцэрнамі, і гандлёвымі дамамі, і асобнымі прадпрыемствамі. А што тычыцца праекта «Беларускія прадукты харчавання», то ён павінен выклікаць цікавасць перш за ўсё ў прыватных вытворцаў.

— Адна са стратэгічных задач праекта — уваходжанне ў рознічныя гандлёвыя сеткі Расійскай Федэрацыі. Для гэтага трэба і граматнае брэндаванне, і граматныя перамовы, і арганізацыя лагістыкі, і сумесны ўдзел у выставах, і прасоўванне праз інтэрнэт. Кожнаму прадпрыемству паасобку зрабіць гэта складана, а калі мы аб'яднаемся і знойдзем паспяховую форму, то гэта можна рэалізоўваць. Сёння большая частка беларускіх тавараў, якія мы пастаўляем у Расію, носіць сыравінны характар: мы адгружаем тушы мяса, сухое малако і г. д. А канечных прадуктаў пад нашымі брэндамі дастаткова мала.

Пры гэтым Анатоль Аканцінаў расказаў, што прадстаўнікі расійскіх гандлёвых сетак вельмі зацікаўленыя ў беларускай прадукцыі:

— Мы вялі перамовы з двума гандлёвымі сеткамі з Санкт-Пецярбурга і Калінінграда — яны вельмі зацікаўлены ў беларускіх таварах. Нават гатовы стварыць секцыі беларускіх тавараў у гіпермаркетах. Бо зараз гіпермаркеты маюць стратэгіі не паніжэння цаны, бо гэта канкурэнцыя ўчарашняга дня, а імкнуцца да нейкай унікальнасці — хочуць стварыць эксклюзіўныя прапановы ў выглядзе гандлёвых марак, секцый, сэрвісаў і г. д.

Але ці гатовыя самі беларускія вытворцы да выхаду на расійскі рынак? Таццяна ЗАКЖЭЎСКАЯ, дырэктар ААТ «РытэйлМаркетынг», лічыць, што пакуль не вельмі:

— З аднаго боку, якасць беларускага тавару з'яўляецца ўваходнай картай на расійскі рынак — на беларускія тавары закупшчыкі гандлёвых сетак як мінімум глядзяць вельмі ўважліва. Але асноўная праблема, на мой погляд, заключаецца ў лагістыцы. Бо наша вытворчасць прадуктаў харчавання першапачаткова была разлічана на сваю краіну і на нашу колькасць насельніцтва, таму беларусы ўмеюць працаваць у Беларусі. І даставіць прадукцыю з Віцебска ў Гомель — праблем няма. Але калі адлегласць павялічваецца да дзясяткаў тысяч кіламетраў, то тут пачынаюцца праблемы.

Па словах Таццяны Закжэўскай, расійскія гандлёвыя сеткі дайшлі да вельмі жорсткіх стандартаў: яны патрабавальна ставяцца да адбору тавару ў асартыментныя матрыцы, і ключавым момантам пры гэтым з'яўляецца забеспячэнне пастаянства паставак. Бо калі тавар не давезлі да крамы і яго няма на паліцах, то магазіны губляюць грошы. І гэтыя страты, калі гаворка ідзе пра сеткі з вялікай колькасцю крам, часам «вылазяць» проста каласальныя. Адпаведна, гандлёвыя сеткі выстаўляюць вялізныя штрафы і пастаўшчыкам. Дарэчы, вядомыя выпадкі, калі беларускія вытворцы працавалі з расійскімі гандлёвымі сеткамі, але потым былі вымушаны адмовіцца ад гэтага — з-за немагчымасці вытрымаць графік і аб'ёмы паставак.

Цікава, што беларускія гандлёвыя сеткі таксама не церпяць збояў у пастаўцы прадуктаў, пра што расказаў **Валеры САВІЦКІ, прадстаўнік ААТ «Еўрагандаль» (гандлёвая сетка «Еўраопт»):**

— Мы ўважліва аналізуем як якасць тавараў, так і іншыя рэчы: напрыклад, калі бачым, што вытворца не можа ў поўнай ступені задаволіць нас па тэрмінах, то мы, як правіла, з ім не працуем. Безумоўна, выпадкі збояў бываюць, у тым ліку і з беларускімі вытворцамі, але мы імкнёмся гэтыя выпадкі мінімізаваць. Што тычыцца штрафаў за невыкананне дамовы, то гэта пэўны інструмент, які дазваляе выхаваць вытворцу. Але мы імкнёмся прыбягаць да такой меры ўздзеяння дастаткова рэдка.

Стаць на паліцу можна — але ці пад сваім брэндам?

Расія — краіна вялікая, і таму, напрыклад, Таццяна Закжэўская лічыць, што нашым вытворцам неабавязкова старацца патрапіць са сваёй прадукцыяй на паліцы самых буйных і самых вядомых гандлёвых сетак — можна дамаўляцца і з гандлёвымі сеткамі меншага маштабу, у тым ліку і з рэгіянальнымі.

Пры гэтым губляць час нельга — выходзіць на расійскія рынкі трэба сёння, пакуль Расія не ўступіла ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА):

— Магчыма, нам трэба ўзбуйняць прадпрыемствы, стварацца нейкія сельскагаспадарчыя холдынгі, скажам, сумесныя з казахамі і расіянамі — каб прадукцыі хапала і для нас, і для паставак на экспарт. Калі Расія ўступіць у СГА, туды пойдуць тавары з Еўропы і Кітая, таму нам трэба там замацавацца зараз, бо інакш мы туды не ўлезем, — лічыць **Таццяна ШВЯДКО, кансультант галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай палітыкі Мінэканомікі.**

Яшчэ адзін шлях да ўваходу ў расійскія гандлёвыя сеткі — гэта пастаўка нашых прадуктаў харчавання не пад сваімі брэндамі, а пад гандлёвай маркай саміх рознічных сетак. Праўда, лічыць Таццяна Закжэўская, такі шлях можа быць вельмі небяспечным для вытворцаў:

— Прадпрыемствы павінны разумець, што расійскія кампаніі вельмі зацікаўлены ў вытворцах як у пастаўшчыках сыравіны для ўласнай гандлёвай маркі (УГМ). Для сеткі крам гэта вельмі выгадна з пункту гледжання грошай, пазіцыянавання, стабільнасці асартыменту, атрыманай маржы і г. д. А вось для вытворчасці — гэта вельмі небяспечны крок. Бо тую маржу, якая існуе пры класічнай працы з гандлёвымі сеткамі, пры працы па УГМ атрымаць нельга, — сказала яна і дадала, што таксама прадпрыемства можа апынуцца фактычна ў закладніках гандлёвай сеткі.

Пры гэтым Таццяна Закжэўская перакананая, што праз год-два расійскія гандлёвыя сеткі пачнуць скупляць прадпрыемствы па выпуску прадуктаў харчавання, якія добра працуюць. І не выключана, што ў тым ліку і беларускія:

— Возьмем, напрыклад, гандлёвую сетку, якая мае сваю вытворчасць мяса. Гэта проста шчасце — нават калі ва ўсіх перабоі з пастаўкамі, ты маеш самы запатрабаваны прадукт у наяўнасці. Калі пастаўляеш мяса на экспарт — маеш валютныя грошы і можаш нешта імпартаваць. Вось, напрыклад, у нас летась былі перабоі з мясам. А мяса і птушка — гэта прадукты, якія павінны заўсёды быць у краме, для магазіна гэта стратэгічна важная катэгорыя. І калі ў цябе 50 крам, то чаго не купіць сваю падсобную гаспадарку і перастаць перажываць, што табе прыйдзецца шукаць мяса?..

Такім чынам атрымліваецца, што беларускім вытворцам выходзіць на расійскі рынак больш выгадна пад сваімі брэндамі. Бо, як кажа Анатоль Аканцінаў, эксперт тавараў і імідж Беларусі — гэта дзве непарыўныя рэчы: калі нехта купляе беларускі прадукт, ён асацыюе гэта з нашай краінай. А вось ці змогуць нашы тавары стаць на паліцы замежных крам пад беларускімі брэндамі — пакажа час.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Чыстае асяроддзе

ЧАВУСЫ БЕЗ БРЫДКАСЛОЎЯ

У сельскім раёне на «круглым стале» падвялі вынікі месячніка па барацьбе з нецэнзурнай лаянкай.

Цэлы месяц, ад 9 студзеня да 9 лютага, у Чавускім раёне праходзілі самыя розныя мерапрыемствы, прысвечаныя культуры мовы. З такой ініцыятывай выступілі праваслаўныя вернікі, іх падтрымалі мясцовыя ўлады, ідэолагі, грамадскія актывісты.

— Самы галоўны вынік, паводле агульнага абмеркавання, што акцыя супраць брыдкаслоўя адбылася, — расказаў **прыхаджанін і памочнік настаяцеля Свята-Узнясенскай царквы ў Чавусах Валерый ГАЎРЫШ**. — Песімістаў не знайшлося: у нас цяпер ёсць досвед, і гэтая праца набудзе свой працяг.

Напрыклад, на моладзевых дыскатэках дзяўчатам і хлопцам прапаноўвалі запоўніць спецыяльныя анкеты. Маладыя людзі не вельмі радаваліся, што перарываюць музыку і танцы, але іх пераконвалі адарвацца ад забаў на некалькі хвілін і адказаць на пытанні пра брыдкаслоўе. Цікава, што яны лічаць грашовыя штрафы лепшым сродкам барацьбы з нецэнзурнай лаянкай, а таксама просяць «перанесці» акцыю і на сваіх бацькоў.

— Вірус брыдкаслоўя жывучы і, відаць, добра замацаваўся ў сем'ях, — зрабілі выснову арганізатары акцыі.

Бібліятэчныя работнікі распрацавалі брашуру, дзе расказалі пра лаянку — ад гісторыі яе ўзнікнення да нашых дзён, уключаючы адміністрацыйныя пакаранні за ўжыванне нецэнзурнай мовы ў грамадскіх месцах.

Падчас спаборніцтваў па міні-футболе арганізацыя БРСМ правяла флэш-моб. З-за халоднага надвор'я давялося перанесці акцыю ў закрытае памяшканне, але і там яна мела рэзананс. На аркушах паперы ўдзельнікі напісалі словы з моладзевага вулічнага жаргону і прапанавалі дапісаць да іх нармальныя, агульнапрынятыя, літаратурныя варыянты.

Настаяцель Свята-Узнясенскай царквы айцец Міхаіл сустрэўся з вучнямі некалькіх школ і пабываў на бацькоўскім сходзе. Святар і вернікі спадзяюцца, што іх будуць часцей запрашаць у навучальныя ўстановы для гутарак пра шкоду брыдкаслоўя. Школьнікі, дарэчы, зрабілі свой уклад у агульную справу і падрыхтавалі выставу малюнкаў на тэму барацьбы са «злой мовай». Аўтараў лепшых малюнкаў улады паабяцалі заахвоціць.

Вынікоўы «круглы стол» вёў **намеснік старшыні Чавускага райвыканкама Анатоль ВІНКЕВІЧ**. Ён лічыць, што тэму культурнай гутаркі, без нецэнзурных слоў, можна абмеркаваць падчас дзён інфармавання ў раёне.

Увогуле месячнік прызнаны паспяховым, таму вырашана працу па выкараненні нецэнзурнай лаянкі са штодзённага жыцця людзей працягваць. А раз на паўгода збірацца на «круглыя сталы» для падвядзення вынікаў. Плануецца, што акцыя далей павінна рушыць у працоўныя калектывы. Аднак гэта азначае не толькі вывешванне адпаведных лозунгаў на прадпрыемствах і ў арганізацыях, але і жывыя гутаркі з работнікамі.

— На наступны «круглы стол» запросім кіраўнікоў прадпрыемстваў, — паабяцала **галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай працы Чавускага райвыканкама Святлана ТАРАНАВА**. — Пад ляжачы камень вада не цячэ, таму трэба працаваць. Гэта толькі здаецца, што ў адказ на гутаркі супраць брыдкаслоўя работнікі будуць толькі смяяцца. Не, яны прыслухоўваюцца. І я ведаю, што ў некаторых месцах падхапілі нашу ідэю: нецэнзурнае слова — «грошык» (у нас гэта была 1 тысяча рублёў) у агульную казну на добрую справу. Так што цяжкі толькі пачатак.

Ёсць звесткі, што і ў іншых раёнах хочуць пераняць чавускую ініцыятыву па барацьбе з брыдкаслоўем. У прыватнасці, адна вялікая навучальная ўстанова вывучае магчымасць аб'явіць сваю тэрыторыю вольнай ад нецэнзурнай лаянкі.

Ілона ІВАНОВА.



Беражы сваё!

Неўзабаве пасля пракурорскай праверкі дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства вызваліў усе памяшканні. У кастрычніку мінулага года яны былі перададзены ва ўласнасць аддзела культуры Хойніцкага райвыканкама.

КАБ ЗАХАВАЦЬ, ВАРТА ПЕРАДАЦЬ... У ДОБРЫЯ РУКІ!

ГЕНЕРАЛЬНАЯ пракуратура Беларусі б'е трывогу: турыстычны прэстыж краіны пад пагрозай! Многія з нашых помнікаў архітэктуры нагадваюць развалiны, даводзяцца да непрыгляднага ці нават аварыйнага стану. І ўсё з-за элементарнай безгаспадарчасці мясцовых улад і Міністэрства культуры.

ВОСЬ зірніце хоць бы на гэты фотаздымак. Што вы на ім бачыце? Скажаце «свінаферму» і памылiцеся. Насамрэч гэта «Фрагменты былой сядзібы «Барысаўшчына» канца XIX-XX стагоддзя ў Хойніцкім раёне, будынкі якой сельскагаспадарчае прадпрыемства «Арывічы» бессаромна прыстасавала пад хлявы для ўтрымання свіней. Калі Генпракуратура падняла дакументы, то высветлілася, што гісторыка-культурная каштоўнасць проста не мае ўласніка...

І гэта не адзіны закінуты помнік архітэктуры. Пад пагрозай разбурэння былы кляштар бернардзінцаў 1726 года ва Ушацкім раёне, сядзібна-паркавы комплекс «Беліца» ў Сенненскім, сядзіба Умястоўскіх у вёсцы Жамыслаўль Іўеўскага раёна. Спіс можна працягваць і працягваць...

Пра магчымыя наступствы парушэння заканадаўства «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» размаўляем з пракурорам аддзела па наглядзе за выкананнем прыродаахоўнага і зямельнага заканадаўства Генпракуратуры Віктарам ЛЯЎШОЙ.

Па выніках леташніх праверак складзена звыш 300 актаў пракурорскага нагляду, 38 службовых асоб прыцягнуты да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці.

— Істотнае. У першую чаргу, вызначаюць статус аб'екта. Бо не ўсе, нават мясцовыя жыхары, ведаюць, што той ці іншы будынак знаходзіцца пад аховай дзяржавы. У якасці прыкладу прывяду сітуацыю, калі адсутнасць ахоўнай дошкі не дазволіла прыцягнуць вінаватых да адказнасці. Так, у пасёлку Карма Гомельскай вобласці зламыснікі разабралі частку цаглянай кладкі Свята-Мікалаеўскай царквы і скралі цэглу. Следства прызнала, што іх у дзеянні не было намеру ў пашкоджанні гісторыка-культурнай каштоўнасці, і адмовіла ў завядзенні крымінальнай справы за наўмыснае разбурэнне помніка гісторыі. Маўляў, парушальнікі не маглі ведаць, што будынак прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю, бо на будынку царквы не было ахоўнай дошкі. У выніку гэтых людзей прыцягнулі да адказнасці толькі за крадзеж.

— Якія яшчэ пытанні Генпракуратура адносіць да праблемных?

— Асобная праблема — уліковыя дакументы. Яны адсутнічаюць у многіх рэгіёнах. Так, з-за адсутнасці ўліковых дакументаў дагэтуль не ўстаноўлены ўласнік гісторыка-культурнай каштоўнасці «Тэрыторыя былога лагера смерці «Трасцянец». Такі ж лёс і ў сталічнага помніка ахвярам гітлераўскага генацыду «Яма». Мы скіроўваем Міністэрства культуры неадкладна ўстанавіць уласніка і перадаць названыя аб'екты ў добрыя рукі. Бо яны знаходзяцца не ў самым лепшым стане і выглядзе.

— А ці шмат у Беларусі аб'ектаў, якія прыйшлі ў непрыглядны стан па віне законнага ўладальніка?

— Хапае. Тым не менш, нягледзячы на шматлікія факты безгаспадарчага ўтрымання гісторыка-культурных каштоўнасцяў, мясцовыя выканкамы не прымаюць ніякіх захадаў. У прыватнасці, яны маюць права ставіць пытанне аб канфіскацыі ва ўласнікаў такіх аб'ектаў у судовым парадку шляхам выкупу дзяржавай ці продажу з публічных таргоў.

— Калі я правільна зразумела, каб аб'ект не разбураўся ў руках аднаго, яго варта перадаць адказным асобам.

— Трэба так рабіць. Але мясцовыя ўлады пакуль шмат дзе бяздзейнічаюць. Пра гэта яскрава сведчыць наступны прыклад. Сядзіба Умястоўскіх, што на балансе СВК «Суботнікі», як я ўжо казаў, знаходзіцца ў аварыйным стане. Тым не менш, з'явіўся чалавек, які хацеў купіць яе за 1 млрд рублёў (!). Але Іўеўскі райвыканкам упусціў гэту магчымасць. Здзелка не адбылася. Калі ж апомніліся, было позна, патэнцыйны пакупнік адмовіўся ад гэтага аб'екта, бо былі іншыя прапановы. Каб актывізаваць прадпрымальнікаў і прыцягнуць сродкі да аднаўлення каштоўнасці, у бліжэйшы час плануецца ўнесці змены ў заканадаўства. У прыватнасці, мы лічым мэтазгодным прадаваць такія аб'екты за 1 базавую велічыню, як гэта робяць у суседняй Расіі.

ПОМНІК КУЛЬТУРЫ ЗА 1 БАЗАВУЮ ВЕЛІЧЫНЮ

— Віктар Уладзіміравіч, 27 студзеня 2012 года Генпракуратура накіравала на адрас Міністэрства культуры пастанову з патрабаваннем ліквідаваць выяўленыя парушэнні. Удакладніце, калі ласка, што гэта за парушэнні?

— Па-першае, на многіх помніках архітэктуры адсутнічаюць ахоўныя дошкі. У Лагойскім раёне, напрыклад, такія дошкі не ўстаноўлены на 60 з 69 гісторыка-культурных каштоўнасцях, у Віцебску — на 99 з 236. Падобныя парушэнні зафіксаваны ва Ушацкім, Полацкім, Бярэзінскім, Мінскім, Столінскім раёнах, у Баранавічах, Пінску і іншых рэгіёнах.

— А якое значэнне маюць такія дошкі для аховы помніка культуры?

— Істотнае. У першую чаргу, вызначаюць статус аб'екта. Бо не ўсе, нават мясцовыя жыхары, ведаюць, што той ці іншы будынак знаходзіцца пад аховай дзяржавы. У якасці прыкладу прывяду сітуацыю, калі адсутнасць ахоўнай дошкі не дазволіла прыцягнуць вінаватых да адказнасці. Так, у пасёлку Карма Гомельскай вобласці зламыснікі разабралі частку цаглянай кладкі Свята-Мікалаеўскай царквы і скралі цэглу. Следства прызнала, што іх у дзеянні не было намеру ў пашкоджанні гісторыка-культурнай каштоўнасці, і адмовіла ў завядзенні крымінальнай справы за наўмыснае разбурэнне помніка гісторыі. Маўляў, парушальнікі не маглі ведаць, што будынак прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю, бо на будынку царквы не было ахоўнай дошкі. У выніку гэтых людзей прыцягнулі да адказнасці толькі за крадзеж.

— Якія яшчэ пытанні Генпракуратура адносіць да праблемных?

— Асобная праблема — уліковыя дакументы. Яны адсутнічаюць у многіх рэгіёнах. Так, з-за адсутнасці ўліковых дакументаў дагэтуль не ўстаноўлены ўласнік гісторыка-культурнай каштоўнасці «Тэрыторыя былога лагера смерці «Трасцянец». Такі ж лёс і ў сталічнага помніка ахвярам гітлераўскага генацыду «Яма». Мы скіроўваем Міністэрства культуры неадкладна ўстанавіць уласніка і перадаць названыя аб'екты ў добрыя рукі. Бо яны знаходзяцца не ў самым лепшым стане і выглядзе.

— А ці шмат у Беларусі аб'ектаў, якія прыйшлі ў непрыгляднага стан па віне законнага ўладальніка?

— Хапае. Тым не менш, нягледзячы на шматлікія факты безгаспадарчага ўтрымання гісторыка-культурных каштоўнасцяў, мясцовыя выканкамы не прымаюць ніякіх захадаў. У прыватнасці, яны маюць права ставіць пытанне аб канфіскацыі ва ўласнікаў такіх аб'ектаў у судовым парадку шляхам выкупу дзяржавай ці продажу з публічных таргоў.

— Калі я правільна зразумела, каб аб'ект не разбураўся ў руках аднаго, яго варта перадаць адказным асобам.

— Трэба так рабіць. Але мясцовыя ўлады пакуль шмат дзе бяздзейнічаюць. Пра гэта яскрава сведчыць наступны прыклад. Сядзіба Умястоўскіх, што на балансе СВК «Суботнікі», як я ўжо казаў, знаходзіцца ў аварыйным стане. Тым не менш, з'явіўся чалавек, які хацеў купіць яе за 1 млрд рублёў (!). Але Іўеўскі райвыканкам упусціў гэту магчымасць. Здзелка не адбылася. Калі ж апомніліся, было позна, патэнцыйны пакупнік адмовіўся ад гэтага аб'екта, бо былі іншыя прапановы. Каб актывізаваць прадпрымальнікаў і прыцягнуць сродкі да аднаўлення каштоўнасці, у бліжэйшы час плануецца ўнесці змены ў заканадаўства. У прыватнасці, мы лічым мэтазгодным прадаваць такія аб'екты за 1 базавую велічыню, як гэта робяць у суседняй Расіі.

«Каб актывізаваць прадпрымальнікаў і прыцягнуць сродкі да аднаўлення каштоўнасці, у бліжэйшы час плануецца ўнесці змены ў заканадаўства. У прыватнасці, мы лічым мэтазгодным прадаваць такія аб'екты за 1 базавую велічыню, як гэта робяць у суседняй Расіі».

«22 ЧАЛАВЕКІ ЗАПЛАЦІЛІ ШТРАФ ЗА РЭКЛАМУ Ў ГІСТАРЫЧНЫМ ЦЭНТРЫ МІНСКА»

— Летась вашы калегі дэманстравалі журналістам суседні з Генпракуратурай будынак № 8 на вуліцы Інтэрнацыянальнай. Апошні, хоць знаходзіцца ў гістарычным цэнтры сталіцы і ўваходзіць у лік гістарычных каштоўнасцяў, меў, мякка кажучы, зусім не эстэтычны выгляд. Абшарпаныя сцены, трэшчыны... Цяпер, гляджу, усё ў парадку.

— Па законе ўласнік любога будынка павінен утрымліваць яго ў належным стане. Але ў гэтай сітуацыі рамонтам Мінаблвыканкам заняўся толькі тады, калі атрымаў пракурорскае прадпісанне. Падобная сітуацыя і з яшчэ адным суседнім будынкам, у якім знаходзіцца кінатэатр «Перамога».

— А што там такое? Я часта наведваю гэты кінатэатр, але ні трэшчын, ні абшарпаных сцен не заўважала.

— Там іншая праблема. Да будынка мінулага стагоддзя, створанага архітэктарам Лангбардам, дзве арганізацыі без дазволу Міністэрства культуры прыбудавалі веранду і кавярню. У дадатак да гэтага размясцілі на фасадзе рэкламу, якая па сваім змесце, колеры і стылі ніяк не адпавядала архітэктуры будынка. Па патрабаванні Генпракуратуры незаконныя пабудовы дэманціраваны, а рэклама знятая. Выяўляліся і іншыя факты размяшчэння рэкламы на будынках цэнтральнай часткі Мінска без узгаднення з Мінгарвыканкамам і Мінкультуры. 22 юрыдычныя асобы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці і заплацілі штрафы ад 20 да 30 базавых велічынь, вынесена 27 прадпісанняў на дэмантаж рэкламнага абсталявання. Работа ў гэтым кірунку працягваецца.

— Праблема незаконнага размяшчэння рэкламы характэрная толькі для Мінска?

— Не. Парушэнні пры размяшчэнні рэкламы ёсць у Мінскім, Докшыцкім, Браслаўскім, Быхаўскім, Івацэвіцкім раёнах, Мазыры, Пінску, Полацку, Брэсце, Магілёве, Віцебску, Оршы і іншых буйных рэгіёнах. Важна памятаць, што ў пагоні за прыбыткам нельга забываць на пачуццё меры і густу, беражлівае стаўленне да фасадаў мінулага і пазамінулага стагоддзяў.

«КАБ БЫЎ У СПІСЕ, ДЫК НЕ ЗНЕСЛІ Б...»

— Віктар Уладзіміравіч, а колькі гісторыка-культурных каштоўнасцяў налічваецца цяпер у адпаведным Дзяржаўным спісе?

— У такі спіс за два апошнія гады ўключана 527 аб'ектаў. На сёння іх больш за 5 тысяч. Аднак варта адзначыць, што нярэдка аб'ектам гістарычнай спадчыны надаецца статус гісторыка-культурнай каштоўнасці незалежна ад іх ступені значнасці і стану. У многіх выпадках пры рашэнні пытання аб уключэнні аб'ектаў у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў не бярэцца да ўвагі тое, што многія з іх значна пашкоджаны. Не робіцца матэрыяльная ацэнка стану аб'екта. Гэта пасля не дазваляе дакладна вызначыць ступень пашкоджання, памер панесенага ўрону і даць абгрунтаваную прававую ацэнку дзеяннямі вінаватых у гэтым асоб. У той жа час ёсць прыклады, калі асобныя аб'екты застаюцца па-за полем зроку Мінкультуры і мясцовых выканкамаў. У прыватнасці, адміністрацыя Першамайскага раёна Мінска знесла даваенны будынак КДБ БССР па вуліцы Парніковай. А ўсё з-за таго, што ён чамусьці не быў унесены ў спіс каштоўнасцяў...

— А хто павінен кантраляваць гэтыя пытанні?

— Кантроль за ўтрыманнем і выкарыстаннем гісторыка-культурных каштоўнасцяў згодна з Законам ажыццяўляе Міністэрства культуры. Праўда, тут ёсць адно «але». Кантралёраў у міністэрстве толькі тры, а гісторыка-культурных каштоўнасцяў на тэрыторыі краіны больш як 5 тысяч. Ды і размешчаны яны, як правіла, на значнай адлегласці адна ад адной. Вось і прыходзяць на падмогу міністэрскім кантралёрам работнікі рэгіянальных аддзелаў культуры. Прычым апошнія сумяшчаюць свае асноўныя абавязкі музейных работнікаў, бібліятэкараў з абавязкамі па кантролі за аховай помнікаў культуры. А гэта не надта эфектыўна, бо ўсе гэтыя «кантралёры», якіх больш за сто па ўсёй рэспубліцы, залежаць ад кіраўнікоў мясцовых выканаўчых камітэтаў, ва ўласнасці якіх і знаходзіцца большасць помнікаў архітэктуры. Таму мы лічым мэтазгодным стварыць пры Міністэрстве культуры асобны кантрольны орган — міжведамасную інспекцыю па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Каб яна была надзелена правамі юрыдычнай асобы і мела адпаведныя падраздзяленні па рэгіёнах. Бо ў той самай Італіі, напрыклад, ахову гісторыка-культурных помнікаў ажыццяўляюць узброеныя службоўцы. Гэта сведчыць аб ступені значнасці захавання спадчыны. А ў нас пакуль няма нават адзінай арганізаванай сістэмы кантрольных органаў...

Напрыканцы праблемнай гутаркі Віктар Ляўша выказаў спадзяванне, што ў хуткім часе і ў нашай краіне ў агульным доступе з'явіцца банк даных помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Каб кожны мог у інтэрнэце імгненна знайсці поўную інфармацыю пра ўсе каштоўнасці, якія маюцца на тэрыторыі нашай краіны.

Надзея ДРЫЛА.

Цяпер у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў налічваецца больш за 5 тысяч аб'ектаў.

Тайнае становіцца відавочным

Летась супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю выявілі на ААТ «Драгічынскі камбікормавы завод» і ў гаспадарцы «Прыазёрны», якая належыць прадпрыемству, факты падзяжу 256 цялят і фіктыўнага продажу іх работнікам таварыства... як жывых. А падчас пераважвання быкоў на ферме ў в. Сірэнеўка было заўважана разыходжанне паміж фактычнай вагой і данымі ўліку — болей чым на 10 тон.

Акрамя гэтага, пры наяўнасці пратэрмінаванай запазычанасці прадпрыемства ў 23,4 млн рублёў дырэктар і галоўныя спецыялісты ААТ атрымалі прэмій на суму звыш 24 мільёны.

У выніку праверак заведзены крымінальныя справы ў дачыненні да загадчыкаў малочнатаварных фермаў «Прыазёрнага», а таксама галоўнага бухгалтара завода.

У гэтым месяцы дырэктар ААТ «Драгічынскі камбікормавы завод» вызвалены ад пасады.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАМЕСТ «ЧАРНІЛА» БУДУЦЬ ВЫРАБЛЯЦЬ БОЛЬШ ЯКАСНЫ АЛКАГОЛЬ АЛЬБО ЎВОГУЛЕ БЕЗАЛКАГОЛЬНЫЯ НАПОІ

У канцы студзеня стала вядома, што вытворчасць пладовых мацаваных ардынарных вінаў (у прастанароддзі — «чарніла») сёлета будзе спынена. Чым выкліканы такі захад? Ці паспрыяе ён зніжэнню п'янства? Ці не ўдарыць па эканоміцы шматлікіх вытворцаў? Гэта высветляў карэспандэнт «Звязды» ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».

Вырабляць віно было вельмі рэнтабельна

«Да нядаўняга часу ў Беларусі 89 прадпрыемстваў (на 1 студзеня 2005 года) мелі ліцэнзіі на вытворчасць пладовых вінаў агульнай магутнасцю больш за 290 млн літраў за год. У 2003-2004 гадах выраблялася рэкордная для нашай краіны колькасць гэтай прадукцыі — 270 млн літраў штогод. Віно выпускалі ўсе, хто хацеў і мог стварыць для гэтага неабходныя ўмовы», — сумна канстатаваў **старшыня «Белдзяржхарчпрама» Іван ДАНЧАНКА**.

Ахвотных вырабляць гэтую прадукцыю было шмат таму, што, у параўнанні з іншымі відамі харчовай прадукцыі, вытворчасць віна была найбольш рэнтабельнай. Спажыванне пладовых вінаў на душу насельніцтва ў пераліку на бязводны спірт у 2005 годзе складала больш за 4 літры. На выпуск «чарніла» і іншай алкагольнай прадукцыі перайшлі піваварныя, кансервавыя, малочныя, хлебапякарныя і сельскагаспадарчыя арганізацыі. Многія з іх не мелі свайго абсталявання па перапрацоўцы пладоў і ягад і завозілі пладовыя вінаматэрыялы з Расіі і Украіны.

Але ж з гэтым трэба было штосьці рабіць

Сітуацыя змянілася пасля прыняцця Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 верасня 2005 года №11, які значна ўзмацніў жорсткасць патрабаванняў да ліцэнзавання вытворчасці алкагольнай прадукцыі і яе якасці. Адначасова ўрадам, пачынаючы з 2006 года, была ўведзена забарона на імпарт пладовых вінаматэрыялаў, што прымусіла прадпрыемствы ствараць асабістыя магутнасці па перапрацоўцы мясцовай пладова-ягаднай сыравіны.

У выніку, не вытрымаўшы новых патрабаванняў, шэраг арганізацый спыніў вытворчасць пладовых вінаў. Сталі пераходзіць на выпуск піва, кансерваў, малочнай, сельскагаспадарчай і іншай прадукцыі. Цяпер у краіне засталося 49 прадпрыемстваў па выпуску пладовых вінаў агульнай магутнасцю 253 млн літраў у год. Цікава, што з іх 22 — арганізацыі камунальнай формы ўласнасці, 8 — канцэрна «Белдзяржхарчпрам», 7 — Белкаапсаюза, 2 — Мінсельгаспрама, па адным належыць НАН Беларусі і Мінтрансу, 8 не маюць ведамаснай падначаленасці.

«З мэтай зніжэння ўзроўню спажывання алкагольнай прадукцыі на душу насельніцтва Дзяржаўнай праграмай нацыянальных дзеянняў па прадухіленні і пераадоленні п'янства і алкагалізму на 2006-2010 гады прадугледжвалася скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці пладовых мацаваных ардынарных вінаў да 10% штогод, — расказвае кіраўнік канцэрна. — Гэтае патрабаванне выканана — скарачэнне больш чым у 7 разоў (са 192 да 27 млн літраў)». Аб'ёмы ж вытворчасці ўсіх пладовых вінаў за 8 гадоў (з 2004 года) знізіліся на 35% і ў 2011-м склалі 174 млн літраў. А ўдзельная вага спажывання гэтых вінаў на душу насельніцтва знізілася больш чым на 20% і склала 3,3 літра ў пераліку на бязводны спірт. Быццам бы няблага.

Цяпер спыняецца выпуск «чарніла»

Але ж, вядома, праблем з алкагалізмам менш не стала. Летась вытворцам «чарніла» працягвалі падкідваць лыжачкі дзёгцю ў вельмі сумнеўныя бочкі (далёка не з мёдам): стаўкі акцызнага падатку былі павялічаны на пладовыя мацаваныя ардынарныя віны ў 5,7 раза ў параўнанні з 2010-м, на пладовыя мацаваныя марачныя, палепшанай якасці і спецыяльнай тэхналогіі — у 6 разоў. Чарговае павышэнне акцызаў на алкагольную прадукцыю адбылося сёлета з 1 студзеня — на 23,5%. У выніку кошт пладовага віна павялічыўся з 4000 рублёў (за 0,7 літра) у 2011 годзе да 14000 у 2012-м. У сувязі з гэтым ажыццяўляць выпуск пладовых вінаў вінаробным арганізацыям краіны стала эканамічна нявыгадна. Вось і вырашылі вытворчасць нізкагатункавых ардынарных вінаў цалкам спыніць.

Яшчэ адным захадам па прадухіленні і змяншэнні п'янства сталі забароны ці абмежаванні па часе продажу пладовых вінаў у рознічным гандлі ў шэрагу раёнаў нашай краіны. Акрамя таго, алкагольныя праблемы вырашаюцца і на ўзроўні Беларусі—Расіі—Казахстана. «Праектам тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы алкагольнай прадукцыі», які будзе прыняты ў найбліжэйшы час Камісіяй Мытнага саюза, з 1 студзеня 2017 года прадугледжваецца выключэнне выкарыстання этылавага спірту рэктыфікаванага з харчовай сыравіны пры вытворчасці вінаў. Адначасова праектам гэтага рэгламенту забараняецца выкарыстанне поліэтыленавай спажывецкай тары пры вытворчасці алкагольнай прадукцыі, у тым ліку пладовых вінаў», — паведамляе Іван Данчанка.

Аднак развіцця вінаробнай галіны ніхто не адмяняў

Не хацелася б, каб эканамічны складнік нашых прадпрыемстваў пацярпеў ад спынення вытворчасці пэўнай прадукцыі. З гэтай мэтай канцэрнам «Белдзяржхарчпрам» сумесна з зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі распрацоўваецца стратэгія развіцця вінаробнай галіны рэспублікі, якая прадугледжвае:

— перапрафіляванне вінаробных прадпрыемстваў на выпуск іншых відаў прадукцыі (вытворчасць сокаўтрымліваючай прадукцыі, безалкагольных напояў, канцэнтраваных пладова-ягадных сокаў і іншага), стварэнне з дробных вінзаводаў участкаў па перапрацоўцы пладова-ягаднай сыравіны і нарыхтоўцы вінаматэрыялаў для буйных вінаробных заводаў;

— арганізацыю вытворчасці пладовых дыстылятаў на вядучых вінзаводах;

— павелічэнне выпуску пладова-ягадных натуральных вінаў (без дабаўлення спірту этылавага рэктыфікаванага з харчовай сыравіны);

— паляпшэнне дызайну і якасці афармлення знешняга выгляду гатовай прадукцыі.

Але гэта яшчэ не ўсё. У найбліжэйшай перспектыве ў асобных вінаробных арганізацыях краіны плануецца арганізаваць вытворчасці новых відаў прадукцыі. Іван Данчанка пералічыў якіх: кальвадосу (яблычны каньяк), пладовых гарэлак, марачных пладовых вінаў, пладовых натуральных сталовых газаваных вінаў з павышанай біялагічнай каштоўнасцю.

Між іншым, павышэнне якасці вонкавага афармлення пладовых вінаў ужо пачалося: з 1 лютага будзе выкарыстоўвацца новы корак. А пачынаючы з 2014 года разліў пладовых вінаў будзе ажыццяўляцца выключна ў шкляную бутэльку еўрапейскага ўзору ёмістасцю 0,75 літра (аналагічна вінаградным вінам).

Ці паспрыяюць захады зніжэнню п'янства?

На думку кіраўніка канцэрна, «вытворчасць новых відаў вінаробнай прадукцыі — прыярытэтны кірунак развіцця вінаробнай галіны, які дазволіць павысіць не толькі якасць, але і экспартныя магчымасці прадукцыі, стварыць асартымент канкурэнтаздольных нацыянальных алкагольных напояў, што будуць вызначацца арыгінальнымі арганалептычнымі характарыстыкамі». А гэта, у сваю чаргу, будзе спрыяць зніжэнню спажывання моцных алкагольных напояў насельніцтвам краіны, сцвярджае Іван Данчанка. Будзем спадзявацца, што так і адбудзецца. Надзею на тое даюць меркаванні медыцынскіх экспертаў, якія пасля прыняцця рашэння аб спыненні вытворчасці «чарніла» сталі актыўна выказвацца ў прэсе на гэты конт. Медыкі лічаць, што ўскладнены доступ да таннага алкаголю (а тым больш яго знікненне) дапаможа многім перастаць піць пастаянна.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ЛІЧБЫ

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у 2011 годзе беларусы ўжылі 12,3 літра чыстага спірту на душу насельніцтва. Дарэчы, парогавае значэнне Сусветнай арганізацыі аховы здароўя — 8 літраў.

ДАВЕДКА:

У цяперашні час да групы пладовых вінаў адносяцца:

— віны пладовыя мацаваныя ардынарныя;

— пладовыя мацаваныя палепшанай якасці і спецыяльнай тэхналогіі;

— натуральныя пладова-ягадныя.

Чым жа адрозніваюцца віды пладовых вінаў?

Тэхналагічны цыкл вытворчасці пладовых мацаваных ардынарных вінаў складае 12-15 дзён з натуральным наброджваннем спірту да 5%, а вінаў палепшанай якасці і спецыяльнай тэхналогіі — да 37-50 дзён з наброджваннем спірту не менш за 10%.

Больш складаная тэхналогія вытворчасці ў натуральных пладова-ягадных вінаў: там выкарыстоўваецца спірт толькі эндагеннага паходжання (назапашаны ў выніку зброджвання цукру, які маецца ў соку, сусле. — **Аўт.**) і яго назапашванне вагаецца ад 9 да 14%. Гэтыя віны бываюць сухія, паўсухія, паўсалодкія, немацаваныя. Цыкл вытворчасці складае ад 64 да 129 сутак, а немацаваных — да аднаго года.

ЗАБАРОНЫ І АБМЕЖАВАННІ Ў АБЛАСЦЯХ

У Брэсцкай вобласці продаж пладовых вінаў забаронены ў 2 раёнах і ў 3 абмежаваны, у Віцебскай — абмежаваны ў 4 раёнах, у Гомельскай — забаронены ў 5 раёнах, у Гродзенскай — у 10 раёнах, у Мінскай — у 7, у Магілёўскай установлены абмежаванні па часе продажу: з 10 да 12 і з 14 да 16 гадзін.

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ОАО «Белвнешэкономбанк» информирует вкладчиков, что с 15 марта 2012 года по действующим договорам срочного банковского вклада (депозита) «Универсальный» с плавающей процентной ставкой в белорусских рублях, заключенным до 14 февраля 2012 года включительно, на срок 3 месяца устанавливается новая процентная ставка в размере СР* + 7 п.п.** (* – ставка рефинансирования, установленная Национальным банком Республики Беларусь, равная 43% на 15.02.2012; ** – процентный пункт).

ОАО «Белвнешэкономбанк». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 6. УНП 100010078».

Паритетбанк

www.paritetbank.by

Открытое акционерное общество «Паритетбанк», расположенное по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а, СООБЩАЕТ, ЧТО 27 ФЕВРАЛЯ 2012 ГОДА
в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк»
ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О процедурных вопросах.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Собрание проводится по адресу:
г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг для составления списка лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, – 14.02.2012.

Лица, имеющие право на участие в собрании, могут ознакомиться с материалами к собранию и получить Бюллетени для заочного голосования под роспись с представлением документов, удостоверяющих личность (представитель акционера – также документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании), с 20 февраля 2012 года по 21 февраля 2012 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров. Лицам, имеющим право на участие в собрании, – владельцам 1 процента голосующих акций, бюллетени направляются заказным письмом или доставляются нарочным.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 23 февраля 2012 года по месту их выдачи, дата подсчета голосов – 24 февраля 2012 года.

Список лиц, принимающих участие в собрании, составляется в дату подсчета голосов. Принимающими участие в собрании считаются лица, возвратившие в установленный срок бюллетени, заполненные с соблюдением установленных в них требований.

Телефон для справок: 288 64 74.

Наблюдательный Совет ОАО «Паритетбанк».

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.

АБО МІР, АБО ЗАЧЫСТКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПАДАРОЖЖА ў Афган Валерыю Котаву прапанавалі ў 1986-м. На той момант ён прайшоў медкамісію. Па сутнасці, падыходзіў, хоць і меў поўнае права адмовіцца — усё ж такі трое дзяцей. Звычайна такім і не прапаноўвалі падобнае «падарожжа». Аднак раптам не змог паехаць адзін з супрацоўнікаў аддзела, патрабавалася замена, і Котаў палічыў адмову недастойнай. Падрыхтоўкі афіцэра бяспекі было ўжо недастаткова.

«Такія афіцэры легальна працуюць пры пасольствах — падтрымліваюць сувязь з органамі аховы правапарадку ў краіне знаходжання, — тлумачыць Валерый Аляксандравіч. — Двойчы да ад'езду я праходзіў спецыяльную перападрыхтоўку. Звычайна так рыхтавалі ўсіх, каго накіроўвалі на службу знешняй разведкі ў Афганістане. Я павінен быў быць кіраўніком асобнай групы».

У лістападзе пятнаццаць чалавек, сярод якіх быў і Котаў, вылецелі з Масквы ў Кабул. Лятуць давялося на велізарным транспартным самалёце, у якім людзей размясцілі зверху, у своеасаблівай люльцы, а ўнізе ляжалі скрыні з патронамі. Кабул з'яўляўся «сталіцай размеркавання» сіл і кадраў. Котаў трапіў у правінцыю Саманган, што на поўначы Афганістана, непадалёку ад правінцыі Балх. Цэнтр правінцыі Балх — досыць вядомы горад Мазары-Шарыф. Цэнтр правінцыі Саманган — невялічкі кішлак Айбак. Тут і была віла, на якой жылі члены нашай опергрупы. Віла размяшчалася ў гарах, за двухметровай агароджай. Ледзь не штодня тэрыторыю атакавалі бандыты рэактыўнымі снарадамі.

Супрацоўнікі ўпраўлення бяспекі, члены аператыўнай групы. Пяты злева ў другім радзе — палкоўнік Котаў.

Але агонь вёўся не прыцэльна, а па плошчы, таму нёс пагрозу найперш звычайным мірным жыхарам кішлака.

НА поўначы Афганістана жылі пераважна таджыкі і ўзбекі. Некаторыя з «нашых» людзей валодалі таджыкскай мовай, іх больш грунтоўна знаёмілі і з традыцыямі краіны. Ад Котава веданне такіх «падрабязнасцяў» не патрабавалася.

— У кожнай правінцыі было мясцовае ўпраўленне бяспекі — хад, — кажа Валерый Котаў. — Я быў саветнікам бяспекі хада, кіраўніком опергрупы, якая складалася з пяці афіцэраў. Былі яшчэ чатыры салдаты, якія з дапамогай радыёстанцыі некалькі разоў на суткі, у пэўны час, выходзілі на Кабул — дакладвалі і атрымлівалі аператыўную інфармацыю. Нашай першай задачай было аказанне дапамогі афганцам, якія падтрымлівалі савецкі бок. Мы разам прымалі рашэнні па бандфарміраваннях.

У кожнай правінцыі былі свае бандыцкія фарміраванні. Некаторыя верхаводы супрацьстаялі толькі Саветам, а іншыя канфліктавалі і паміж сабой. Зброю, пераважна стралковую, боепрыпасы бандам пастаўляў суседні Пакістан. «Узброеныя» караваны ішлі галоўным чынам па начах. Наша авіяцыя нярэдка бамбіла іх, але ўсіх разбамбіць было нерэальна...

Аператыўная інфармацыя опергрупы Котава мела дачыненне ў тым ліку да перасоўвання мясцовых бандаў. З іх кіраўнікамі спрабавалі ўстанавіць кантакт, дабіцца шляхам перамоў неабходнага прымірэння. Больш за тое, калі такое прымірэнне дасягалася, наш бок дапамагаў верхаводам і членам іх сем'яў атрымаць... належную медыцынскую кансультацыю і дапамогу. З гэтым у кішлаках была, мякка кажучы, праблема: ні лекаў, ні спецыялістаў. Міралюбівa настроеныя бандыты прыводзілі ноччу сваіх жонак, дзяцей на медагляды, і сама гэтая магчымасць выклікала ў іх моцную павагу да нашых.

Непрымірымыя бандыты лічылі савецкіх воінаў выключна акупантамі, а таму іх вынішчалі. Пра ворагаў збіралі інфармацыю (у кожнай бандзе наш бок меў сваіх паведамляльнікаў), распрацоўваўся план. Гэта магла быць зачыстка ўсёй банды. Нашы нападалі раптоўна і не пакідалі праціўніку шанцаў на выжыванне, бо прыцягвалі і войскі — артылерыю, танкі. А магла быць і спецаперацыя па ліквідацыі асобна ўзятага верхавода...

Адзін «непрымірымы» надта любіў пакапацца ў механізмах гадзіннікаў. Знаёмы гэтага верхавода — наш паведамляльнік — прывёз таму ў падарунак з Мекі шыкоўны гадзіннік, але ўручыў яго толькі пасля таго, як опергрупа Котава аснасціла падарунак выбуховым прыстасаваннем...

ГІНУЛІ, вядома, і паведамляльнікі, калі іх «выкрывалі» ў бандзе, дый не толькі яны. Адзін трагічны эпізод хоць і не звязаны непасрэдна з хлопцамі Котава, але ўрэзаўся яму ў памяць. У правінцыі Саманган быў трубаправодны батальён, які забяспечваў перапампоўванне па трубах газы — ад мяжы з Узбекістанам да Кабула. Паліва было патрэбна самалётам на кабульскім аэрадроме... Аднойчы на камандным пункце гэтага батальёна Котаў, які прыехаў па паліва для сваіх машын, убачыў наступную карціну. Батальён пастроены, камбат надрываецца, распякае на чым свет стаіць усіх нелітаратурнымі словамі, маўляў, вось такое з-за вашага галавацяпства атрымліваецца. Побач, на разгорнутых плашч-палатках ляжаць пяцёра нашых мёртвых хлопцаў. Як высветлілася, хлопцы, якія на адной з помпавых станцый сачылі за працэсам пампавання, страцілі пільнасць і зняслі ноччу вартавога. Тут басмачы ўсіх і перабілі.

Дэмакратычная Рэспубліка Афганістан. Савецкі ваенны ўрач з афганскімі дзецьмі.

— Наша опергрупа са зброяй у руках ні ў якіх аперацыях не ўдзельнічала, — распавядае Валерый Аляксандравіч. — Такім быў загад Андропава. Паводле нарматыву, двойчы на год нас адпускалі ў двухтыднёвы водпуск на радзіму. Як правіла, назад мы вярталіся недзе праз месяц, бо цяжка было вярнуцца дзень у дзень — надвор'е магло не спрыяць пералётам...

ПРЫБЫКНУЦЬ да тых умоў было нерэальна — можна было толькі прыстасоўвацца. Наогул на забеспячэнне бытавых умоў ішло шмат часу.

Лазню цяплілі двойчы на тыдні... Ежу гатавалі самі. Раз на месяц ездзілі па прадукты ў Мазары-Шарыф, дзе былі спецыяльныя крамы для савецкіх спецыялістаў. Хлеб і ўсё неабходнае набывалі за афганскія грошы. У Мазары-Шарыфе, дарэчы, было шмат спецыялістаў з Гродна, бо ў горадзе працаваў азотна-тукавы завод. Нашы займаліся навучаннем афганцаў.

Зімой у гарах вельмі холадна, і нават закладзеныя цэглай вокны не рабілі памяшканне цяплейшым. А цэглай вокны заклалі пасля чарговага абстрэлу, калі ад шыбаў засталіся драбнюткія асколкі. Сагравацца павінны былі дапамагчы старыя газавыя плыты, аднак такое цяпло развейвалася, як толькі пліта пераставала працаваць. Пакінуць жа іх у рабочым стане на ноч было страшна — можна было загарэцца. Пару разоў ледзь так не здарылася. Потым Котаў папрасіў свайго начальніка набыць новыя плыты. І на вілу прывезлі добрыя, бяспечныя нямецкія плыты.

Ваду даводзілася вазіць за дзясяткі кіламетраў. Далей яе выліваліі ў закрыты басейн, што быў на віле, адкуль і бралі для розных патрэб. Перавозкай вады дазвалялі займацца толькі такому афганцу, сваякі якога служылі разам з нашымі салдатамі. Каб у таго не з'явілася магчымасць падсыпаць што-небудзь непатрэбнае ў ваду...

УСТУДЗЕНІ 1989-га, за месяц да вываду войскаў з Афганістана, Котаў і яго афіцэры пакінулі Айбак назаўсёды. Яны ведалі пра блізкі вывад войскаў, але сваім падсаветным нічога не гаварылі — дый тыя і не паверылі б. Пра свой жа ад'езд паведамілі літаральна за два дні. За опергрупай з Мазары-Шарыфа прыйшлі бронетранспарцёры. Паездка да Кабула праходзіла пад аховай войскаў. Ніякіх правакацый падчас вываду войскаў з боку бандфарміраванняў не было. Машыны, у тым ліку баявая разведвальная, снарады, зброя засталіся афганцам...

З Кабула вылецелі ў Маскву. Адтуль Котаў прыехаў у Гродна, дзе праслужыў да 52 гадоў, калі і выйшаў на пенсію. У 1995-м вярнуўся ў Мінск, дзе працягвае жыць і сёння.

P.S. ***Па традыцыі Камітэт дзяржбяспекі збірае напярэдадні 15 лютага ветэранскую арганізацыю, у тым ліку членаў іх сем'яў і членаў сем'яў загінулых. Урачысты збор адбываецца ў Клубе імя Ф.Э. Дзяржынскага. Непасрэдна 15 лютага ветэраны баявых дзеянняў ускладаюць кветкі на Вострае слёз і ўзнімаюць чарку. Трэці тост — за тых, хто не вярнуўся.***

Святлана БАРЫСЕНКА.

Валерый Аляксандравіч пераапрануўся і ўзяў зброю толькі для фота.

ЗІМОВЫЯ ЎМОВЫ, СКЛАДАНЫЯ ДАРОГІ...

У Асіповіцкім раёне на аўтадарозе «Мінск — Гомель» раніцай 9 лютага аўтамабіль «Форд» ударыўся ў мікрааўтобус «Мерседэс», які стаяў на абочыне. За рулём быў 24-гадовы жыхар Мазыра, які не справіўся з кіраваннем. Ён і 31-гадовы пасажыр былі шпіталізаваны з траўмамі, аднак на наступную раніцу ў рэанімацыі вадзіцель «Форда», які атрымаў чэрапна-мазгавую траўму і пералом касцей таза, памёр.

Між тым, Магілёўская ДАІ паведамляе, што за мінулыя пятніцу, суботу і нядзелю інспектары выявілі на дарогах рэгіёна больш за 2 тысячы парушэнняў. Прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці 430 вадзіцеляў, якія перавысілі дазволеную хуткасць руху. Праігнаравалі абавязковае выкарыстанне рамянёў бяспекі 295 чалавек. 29 нецвярозых вадзіцеляў затрыманы і адхілены ад кіравання аўтамабілямі. Гэтыя лічбы ўражваюць, тым больш калі размова ідзе пра складаныя ўмовы надвор'я і далёка не ідэальныя зімовыя дарогі.

Ілона ІВАНОВА.

Пасля выступлення «Звязды»

Домік у Горках пакуль стаіць

МАГІЛЁЎСКІ аблвыканкам даслаў у рэдакцыю «Звязды» рэагаванне на артыкул «Домік у Горках», змешчаны 18 студзеня. Дом, дзе жыў беларускі пісьменнік Максім Гарэцкі, будзе выселены, але далейшы лёс гэтай пабудовы канчаткова вызначыцца пасля дэталёвага абследавання.

Двухпавярховы дом № 3 на вуліцы Агранамічнай у горадзе Горкі вядомы тым, што ў ім з 1926 па 1928 год жыў Максім Гарэцкі. Ён 1925 года пабудовы, драўляны і абкладзены цэглай. У васьмі кватэрах тут жывуць людзі, але яны чакаюць перасялення ў новыя кватэры ў сувязі з прызнаннем дома аварыйным. У межах добраўпарадкавання да фестывалю «Дажынкі-2012» гэты будынак мяркуюць знесці. Аднак больш за паўсотню жыхароў Горак падпісалі зварот да райвыканкама з просьбай захаваць дом, дзе жыў класік беларускай літаратуры.

«Звязда» ў артыкуле «Домік у Горках» дала магчымасць выказацца ўсім зацікаўленым бакам: прадстаўніку мясцовай улады, грамадскаму актывісту, жыхарцы дома, камунальніку. Кожны мае свой пункт гледжання і інтарэс, аднак усё ж ёсць спадзяванні, што ўрэшце будзе знойдзены кампраміс дзеля добрай справы.

У адказе Магілёўскага аблвыканкама, падпісаным **намеснікам старшыні Валерыем МАЛАШКАМ,** у прыватнасці, паведамляецца, што дом знаходзіцца на балансе прадпрыемства «Камунальнік» ад 2003 года і мае фізічны знос 78,9%.

Цытуем: «У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь па Горацкім раёне ён не значыцца. Будынак быў абнесены сілікатнай цэглай, што змяніла яго першапачатковы выгляд.

Па інфармацыі Горацкага райвыканкама, будынак знаходзіцца ў такім стане, што правядзенне капітальнага рамонту з'яўляецца немагчымым. У сувязі з гэтым, рашэннем Горацкага райвыканкама ад 16.11.2011 № 19-98 будынак на вуліцы Агранамічнай, 3 уключаны ў графік зносу старых і аварыйных дамоў на 2012 год, а ў маі-чэрвені 2012 года запланавана адсяленне жыхароў у 60-кватэрны жылы дом, які будуецца з гэтай мэтай.

Канчатковае рашэнне па далейшай эксплуатацыі (кансервацыі) аб'екта будзе вызначана пасля дэталёвага абследавання апорных і агароджальных канструкцый будынка».

Далей у лісце нагадваецца, што «разам з тым, у мэтах увекавечання памяці пісьменніка, мясцовымі ўладамі прымаюцца захады па зберажэнні і папулярызацыі літаратурнай спадчыны і памяці Максіма Гарэцкага».

Пра гэта ішла размова і ў артыкуле «Домік у Горках»: у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ёсць кабінет-музей Максіма Гарэцкага і мемарыяльная дошка, усталяваная ў час святкавання 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. Імя класіка беларускай літаратуры носіць раённая бібліятэка і вуліца (раней былая Зялёная, потым імя 40-годдзя Кастрычніка), на якой жыў Максім Гарэцкі, калі вучыўся ў каморніцка-агранамічным вучылішчы. У Горках праводзяцца Гарэцкія чытанні, якія арганізуюць сумесна раённы гісторыка-этнаграфічны музей і акадэмія, і паводле іх матэрыялаў выдаюцца зборнікі тэзісаў, прысвечаныя вывучэнню жыццёвага і творчага шляху Максіма Гарэцкага. Таксама ў вёсцы Багацькаўка Мсціслаўскага раёна ёсць мемарыяльны дом-музей пісьменніка.

Тым не менш, лёс дома на вуліцы Агранамічнай, як відаць з адказу Магілёўскага аблвыканкама ад 8 лютага, усё яшчэ канчаткова не вызначаны: добра, што яго жыхары дакладна пераселяцца ў новыя кватэры з аварыйнага будынка, але што будзе далей з самім домам, пакуль канчаткова не вырашана. Таму рэдакцыя просіць улады дадаткова паведаміць пра вынікі абследавання дома Гарэцкага спецыялістамі і рашэнне, якое будзе ўрэшце прынята ў дачыненні да яго.

Ілона ІВАНОВА.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 29 февраля 2012 года проводит 2-й повторный открытый аукцион от 20 января 2011 года по продаже имущества республиканской собственности на 3-ем открытом аукционе

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Наработка в часах	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
4/11	Самолёт Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г.	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1969	5 118	1 526 000 000	152 600 000
6/11	Вертолёт Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017	н.п. Мачулищи. в/ч 06752	1987	594	11 278 000 000	1 127 800 000
7/11	Вертолёт Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1986	593	10 411 000 000	1 041 100 000
8/11	Вертолёт Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 № 821100140032, КАУ-140 № 821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г.	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1983	1 774	6 073 000 000	607 300 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, каб. № 637 **29 февраля 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **16.00 24 февраля 2012 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **29 февраля 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

ДВАЙНЫ НАЕЗД

У Чашніках 18-гадовы студэнт, жыхар Мінска, знаходзячыся за рулём аўтамабіля «Нісан», наехаў на двух пешаходаў, жыхароў вёскі Альшанка. Яны ішлі па правай узбочыне дарогі ў сустрэчным кірунку. Аднаго з пешаходаў адкінула на паласу сустрэчнага руху, дзе на яго наехаў «Фальксваген». «Нісан» апынуўся ў кюветце і ўрэзаўся ў агароджу. Пешаходаў, пацярпелых у выніку ДТЗ, шпіталізавалі ў Чашніцкую цэнтральную раённую бальніцу. Той, якога пераехалі двойчы, праз некалькі гадзін памёр ад атрыманых траўмаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГРУЗАВІК... ПАЗБАВІЎ ЛЮДЗЕЙ ЦЯПЛА

У Полацку МАЗ з прычэпам пакінуў без ацяплення жыхароў двух дамоў. А трэцяй гадзіне дня дыспетчар КУП «Жыллёва-камунальная гаспадарка г. Полацка» паведаміла ў службу выратавання пра тое, што грузавы аўтамабіль «МАЗ» сутыкнуўся з надземным трубаправодам цеплатрасы.

У выніку гэтага незвычайнага дарожна-транспартнага здарэння адбыўся парыў трубаправода па вуліцы Ленінградская. Як вынік, адбылося аварыйнае адключэнне цеплазабеспячэння двух жылых трохпавярховых дамоў (у кожным па 12 кватэр).

Для ліквідацыі парыву трубаправода задзейнічаны аварыйныя брыгады КУП «Жыллёва-камунальная гаспадарка г. Полацка»: чатыры адзінкі тэхнікі, больш за дзесяць чалавек. На наступныя суткі — а першай гадзіне ночы — работы па аднаўленні трубаправода былі скончаны. Цеплазабеспячэнне было адноўлена ў поўным аб'ёме.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота Магілёўскай ДАІ.

Дзяржканторль

ПЛАНЫ І РЭАЛЬНАСЦЬ — ВЯЛІКАЯ РОЗНІЦА

ПРА гэта сведчыць праведзеная Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці праверка будаўніцтва і рэканструкцыі жывёлагадоўчых аб'ектаў.

У леташніх планах на Гродзеншчыне значыліся 72 аб'екты жывёлагадоўлі, у тым ліку планавалася пабудаваць 23 новыя малочнатаварныя фермы. А што зроблена? Фактычна ў поўным аб'ёме пабудаваны толькі 2 фермы, на 15 — уведзены пускавыя комплексы. А на 6 астатніх не дайшла справа нават да гэтага. Што ж тычыцца рэканструкцыі, то з 49 МТФ уведзены ў эксплуатацыю толькі 14.

Адной з прычын такой сітуацыі, лічыць Камітэт дзяржкантролю, з'явілася памылковае праектна-арганізацыйнае рашэнне па выкананні значнага аб'ёму работ гаспадарчым способам, без індывідуальнай прывязкі да канкрэтнай сельскагаспадарчай арганізацыі. Як справілася з пастаўленай задачай, калі аграрнае прадпрыемства не мае будаўнічага падраздзялення, кваліфікаваных спецыялістаў, неабходнай тэхнікі? Адсюль неабходнасць карэкціроўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і, як вынік, зацягванне тэрмінаў будаўніцтва.

Больш за тое, у шэрагу выпадкаў падчас будаўніцтва гаспадарчым способам былі парушаны нормы заканадаўства. Прычым з наступствамі, якія цягнуць за сабой крымінальную адказнасць. Напрыклад, у СВК «Сінькі» Смаргонскага раёна, дзе работнікі працавалі па грамадзянска-прававых дагаворах (так званыя «шабашнікі»), выяўлена завышэнне кошту выкананых работ па жывёлагадоўчых аб'ектах на агульную суму 370 мільёнаў рублёў. А ў СВК «СаўБел» гэтага ж раёна — на 215 мільёнаў рублёў.

У выніку праверак Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці прадухілена выплата сродкаў з рэспубліканскага бюджэту ў суме больш за 758 мільёнаў рублёў. У дачыненні да службовых асоб вышэйзгаданых сельгаскааператываў прававахоўнымі органамі заведзены крымінальныя справы.

Сёлета на Гродзеншчыне мяркуецца пабудаваць 18 новых малочнатаварных фермаў і рэканструяваць 108 жывёлагадоўчых аб'ектаў. Самы час улічыць памылкі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КАЗУСЫ І РЭБУСЫ ГУРТКОВАЙ ПРАЦЫ

СУПРАЦОЎНІКІ Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці правялі маніторынг якасці паслуг, прадастаўленых сістэмай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Спрабаваў выдаць за гурткоўцаў

Па-першае, была адзначана нізкая наведвальнасць паловы з праверэных гурткоў. Праведзены аналіз іх працы паказаў на зніжаную цікавасць дзяцей да заняткаў, якія там праводзяцца.

Напрыклад, гурток «Спартыўныя гульні» Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Кастрычніцкага раёна Віцебска працуе на базе СШ № 6. Высветлілася, што выкладчык гуртка — фізрук у гэтай жа школе. У канкрэтны дзень падчас праверкі на занятку прысутнічалі ўсяго 4 чалавекі з усіх 12 гурткоўцаў. Кіраўнік гуртка не знаходзіўся ў спартыўнай зале, а дзеці былі самі па сабе. Пры паўторным наведванні — усяго праз два дні(!) — кантралёры ўстанавілі, што заняткі наогул не праводзіліся. Спартыўная зала была адчынена, трэнер адсутнічаў, — яго шукалі пры дапамозе адміністрацыі школы. Трэнер, калі пачуў, што прыйшлі праверальнікі, хутка сабраў па школе 15 вучняў, якіх спрабаваў выдаць за гурткоўцаў.

Радзіма пачынаецца з... трэнажораў?

У краязнаўчым гуртку «Мая малая Радзіма» Палаца творчасці дзяцей і моладзі Чыгуначнага раёна Віцебска на момант візіту кантралёраў заняткі не праводзіліся. Наогул, як высветлілася, група была скамплектавана фармальна. Фактычна замест арганізацыі працы гуртка па краязнаўстве яго кіраўнік 4 разы на тыдзень прыглядвала за тым, як хлопцы самастойна займаюцца на трэнажорах.

Выявілася і некалькі выпадкаў вызначэння раскладаў заняткаў для забеспячэння нагрузкі кіраўнікам гурткоў, але без уліку рэальнай магчымасці дзяцей наведваць гэтыя гурткі. Напрыклад, паводле тлумачэнняў кіраўніка гуртка «Мяккая цацка», што дзейнічае ў аграрным гарадку Дабрамыслі Лёзненскага раёна, частка навучэнцаў адсутнічала, бо яны не пражываюць у гэтым населеным пункце, а час адпраўлення рэйсавага аўтобуса не супадае з часам заканчэння заняткаў.

У гуртку «Мая Лёзненшчына» ў райцэнтры Лёзна ў СШ № 1, як высветлілася, навучэнцы на суботніх занятках адсутнічалі. Гурток працуе 2 разы на тыдзень (серада і субота, па 3 гадзіны). Кіраўнік гуртка патлумачыла, што дзеці былі на занятках, але... яна адпусціла іх на гадзіну раней.

Няма грошай на паперу

Як высветлілі кантралёры, летась у Віцебскага абласнога палаца дзяцей і моладзі ўвогуле адсутнічалі сродкі на набыццё матэрыялаў для вядзення гуртковай работы: паперы, тканіны, металічных вырабаў, клею, пенапласту, паліва для мадэляў і гэтак далей. Неабходныя матэрыялы набываліся за кошт бацькоў або спонсараў: напрыклад, у справу ішлі адходы вытворчасці — абрэзкі тканіны, скуры, футра. За ўвесь мінулы год аддзелам тэхнічнай творчасці былі набыты толькі зарадная прылада і акумулятар для гонак на электрамабілях і зборныя мадэлі караблёў на агульную суму 1,4 мільёна рублёў. Не сакрэт, што адна з істотных праблем у арганізацыі работы гурткоў тэхнічнай накіраванасці — недахоп кадраў. Дарэчы, спецыялістаў для такой працы навучальныя ўстановы не рыхтуюць. Як правіла, ёю займаюцца энтузіясты, якія маюць навыкі мадэлявання. Але пры гэтым да іх прад'яўляюцца спецыяльныя кваліфікацыйныя патрабаванні. Напрыклад, неабходна вышэйшая прафесійная або сярэдняя спецыяльная адукацыя. Але ж ёсць спецыялісты без адпаведнай адукацыі, якія могуць многаму навучыць дзяцей. Ды нельга браць іх на працу. І ў выніку адбываюцца сумныя «казусы»: весці гурток па авіяцыйным мадэляванні адмовілі нават майстру спорту па авіямадэлізме — з-за яго неадпаведнасці патрабаванням па адукацыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Злачынца вярнуўся, і...

38-гадовы мужчына, які спаў на праезнай частцы, загінуў пад коламі аўтамабіля ў вёсцы Старыя Журавічы Рагачоўскага раёна. Кіроўца з месца здарэння знік. Але ж, калі на месцы здарэння ўжо працавала следча-аператыўная група, ён вырашыў вярнуцца і паглядзець, што там адбываецца.

Пасадзіў за руль знаёмага, а сам заняў месца пасажыра. На іх бяду, супрацоўнік аддзела ДАІ спыніў аўто і запісаў даныя. Крыху пазней быў знойдзены маленькі кавалачак бампера, па якім і ўстанавілі марку машыны — ВАЗ 21099. Міліцыянеры хутка выявілі аўтамабіль, да бампера якога знойдзены абломак падышоў ідэальна. Дарэчы, вінаваты добра вядомы супрацоўнікам ДАІ. Паўгода таму ён быў пазбаўлены правоў за кіраванне транспартам у стане алкагольнагаап'янення, пасля чаго зноў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці — за кіраванне аўтамабілем без дакументаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «МИНСКТОРГАВТОТРАНС»

Полное наименование, местонахождение брокера: **ООО «Промреестр», Беларусь, г. Минск, ул. К. Цеткин, 16-608. Тел.: 200 49 79, 200 46 37.**

Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: **Открытое акционерное общество «МИНСКТОРГАВТОТРАНС», г. Минск, ул. П. Бровки, 30.**

Кол-во простых акций, которое намерен приобрести покупатель: **15 000 (пятнадцать тысяч) шт.**

Максимальный предел цены, по которой покупатель намерен приобретать акции – **30 000 (тридцать тысяч) белорусских рублей.**

Сроки, форма и порядок оплаты акций – **безналичное перечисление денежных средств на счет брокера продавца в день заключения сделки на бирже в порядке, установленном системой расчетов в торговой системе ОАО «БВФБ».**

Место заключения сделки: **ОАО «БВФБ», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, 48А.**

Дата начала и окончания покупки акций: **с 17 февраля 2012 г. по 16 марта 2012 г.**

Полное наименование покупателя акций: **Антипенко Яна Леонидовна.**

Местонахождение покупателя акций: **г. Минск, ул. Старовиленская, 95-42. Тел. 8 029 670 05 94.**

Медыясупрацоўніцтва

НАПІШАМ ГІСТОРЫЮ «ЗВЯЗДЫ» РАЗАМ!

Згодна з Пагадненнем аб інфармацыйным супрацоўніцтве паміж рэдакцыяй газеты «Звязда» і Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пачалася падрыхтоўка да навукова-практычнай канферэнцыі, прымеркаванай да 95-годдзя заснавання, 70-годдзя першага падпольнага выхаду «Звязды» ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Запрашаем прыняць удзел у гэтым мерапрыемстве не толькі навукоўцаў, але і педагогаў, краязнаўцаў, супрацоўнікаў і чытачоў газеты розных пакаленняў. Гэта будзе яшчэ адзін крок у напісанні больш поўнай і падрабязнай гісторыі найстарэйшай рэспубліканскай газеты.

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» і ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ
праводзяць рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю
«ГАЗЕТА «ЗВЯЗДА»Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ І КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ:
(ДА 95-ГОДДЗЯ ЗАСНАВАННЯ, 70-ГОДДЗЯ ПЕРШАГА ПАДПОЛЬНАГА ВЫХАДУ «ЗВЯЗДЫ» Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ)»

Час правядзення: 24 мая 2012 г.

Месца правядзення: Інстытут гісторыі НАН Беларусі (г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1)

ПРАБЛЕМНАЕ ПОЛЕ:

1. Арганізацыйнае станаўленне газеты «Звязда»

❍ Заснаванне і фарміраванне рэдакцыі.

❍ Склад рэдакцыі і кадравая палітыка, аўтары і карэспандэнты выдання.

❍ Праграма газеты «Звязда» (эвалюцыя тэматыкі, рубрыкі) на розных этапах арганізацыйнага станаўлення.

2. Гісторыка-культурная спадчына на старонках газеты «Звязда». Папулярызацыя гістарычных ведаў

❍ Беларуская мова і адукацыя: пытанні адраджэння і пашырэння.

❍ Праблемы захавання гістарычнай спадчыны.

❍ Трансляцыя гістарычных ведаў.

❍ Постаці і праблемы нацыянальнага руху.

3. Адлюстраванне грамадска-палітычнага жыцця

❍ Нацыянальная ідэя і дзяржаўная нацыянальная палітыка.

❍ Грамадска-палітычныя працэсы.

❍ Ваенныя і рэвалюцыйныя падзеі.

❍ Газета «Звязда» ў гады Вялікай Айчыннай вайны: «Зброяй палымянага слова».

❍ Асвятленне грамадска-палітычнага і культурнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь.

4. Стэндавыя даклады.

Рабочыя мовы: беларуская і руская.

Даклады і заяўкі (на флэш-карце, CD/DVD і адзін варыянт у друкаваным выглядзе) прымаюцца да **21 красавіка 2012 г.** па адрасе аркамітэта: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, каб. №: 226, 230. Кант. тэл.: (017) 284-18-39, 284-25-55.

E-mail: *smenic18@mail.ru.*

Патрабаванні да афармлення: даклад аб'ёмам да 6 старонак павінен быць адрэдагаваны. Інтэрвал — адзінарны. Палі: злева/справа — 25 мм, зверху/знізу — 30 мм. Шрыфт: Times New Roman; памер 14 пт; стыль — звычайны. Праз адзін інтэрвал ад верхняга поля друкуецца прозвішча і ініцыялы аўтара. На наступным радку — поўная назва навучальнай установы (арганізацыі), горад і e-mail, вылучаныя курсівам. Затым, праз адзін інтэрвал звычайнымі літарамі, тлустым шрыфтам друкуецца назва даклада, выраўноўванне па цэнтры (згодна з узорам). Спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. **Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заяў на ўдзел у канферэнцыі і тэкстаў дакладаў!**

Па выніках канферэнцыі будзе выдадзены зборнік матэрыялаў.

Выдаткі, звязаныя са знаходжаннем на канферэнцыі, бярэ на сябе камандзіруючы бок.

Заяўка на ўдзел у канферэнцыі:

1. Прозвішча, імя і імя па бацьку.
2. Месца працы, пасада.
3. Навуковая ступень і навуковае званне.
4. Назва даклада (і абсталяванне, неабходнае для выступлення).
5. Працоўны або хатні адрас, кантактны тэлефон (з кодам населенага пункта), факс, e-mail.

Кватэрнае пытанне

КУХНЮ ПАВЯЛІЧЫЦЬ НЕ ЎДАСЦА?

Летась мы купілі двухпакаёўку ў старым жылфондзе, сёлета плануем зрабіць рамонт з перапланіроўкай: хацелася б, прынамсі, павялічыць памеры кухні (яна абсталявана газавай плітой) за кошт змяншэння плошчы аднаго з пакояў. У якім парадку можна атрымаць дазвол на правядзенне такіх работ?

А. Усаў, *Мінскі р-н.*

Парадак ажыццяўлення перапланіроўкі жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах дзяржаўнага і прыватнага жыллёвых фондаў вызначаны спецыяльным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2006 г. № 1805). Гэтым дакументам забаронена, у прыватнасці, ажыццяўленне работ з парушэннем дзейных будаўнічых, супрацьпажарных, санітарна-гігіенічных патрабаванняў, заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці.

Работы па пераўладкаванні і перапланіроўцы жылога памяшкання ў адпаведнасці з названым Палажэннем павінны праводзіцца на падставе дазволу мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і праекта, распрацаванага і ўзгодненага ў вызначаным парадку. Аднак у гэтым канкрэтным выпадку атрымаць яго, напэўна, не ўдасца, бо павелічэнне плошчы кухні, абсталяванай газавай плітой, за кошт жылога пакоя прывядзе да таго, што кухня акажацца размешчанай над і пад жылымі пакоямі ніжняга і верхняга паверхаў, што катэгарычна не дапускаецца. Такое патрабаванне ёсць у будаўнічых нормах Рэспублікі Беларусь (п. 7.16 СНБ 3.02.04-03 «Жылыя будынкі»).

Віктар САВІЦКІ.

Усміхнемся

☺ **На Дзень святога Валянціна жанчына ці атрымае падарунак ад мужчыны, ці будзе пілаваць яго за тое, што не атрымала падарунка. Але і ў тым і ў другім выпадку яна атрымае задавальненне.**

— Ты чаго такі пакамечаны?
— Ды п'яны сеў у машыну, завёў, аказалася пральная.

Тыя, хто кажа, што ўначы есці нельга, хай паспрабуюць растлумачыць, для чаго ў халадзільніку лямпачка.

☺ З запісной кніжкі педанта:
— трамвай — 0,5$.
— газета — 0,7$.
— не памятаю, куды дзеў — 125$.

Не такі страшны Кастанеда, як той, хто яго прачытаў.

— Тата, дай грошай!
— А чароўнае слова?
☺ — Зацяжарала.

Цікавая штука — дамафон! Сёння ўпусціў у пад'езд трох «коней у паліто», «дзеда Піхто» і «Агнію Барто».

На мясцовым ТБ перадача тыпу «Фазэнды». Пасля рэкламы:
— Гэта што за дрэнь?! Дзе мой камін?!
— Андрэй, Андрэй — камера ўжо працуе-е-е!..
— Якая пышнасць! А як вы пераўтварылі мой камін! Прыгажосць!

Ніякае каханне не чакаеш так, як аўтобус у мінус 30.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Адказы на сканворд

Па гарызанталі: Тадэўш. Пальто. Кайсак. Лаўро. Эгрэт. Рыс. Мурог. Кіл. Карабок. Ава. Алаан. Тупм. Такаты. Рыбмар. Цэх. Тэмп. Сапата. Адбат. Кара. Арат. Тангенс. Аркестр. **Па вертыкалі:** Сертыфікат. Гаразнік. Заюк. Арарат. Работа. Эра. Бокс. Аба. Лямка. Пагоны. Кіну. Кадат. Муар. Пасажыр.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.30	18.17	9.47
Віцебск —	8.23	18.04	9.41
Магілёў —	8.21	18.07	9.46
Гомель —	8.13	18.08	9.55
Гродна —	8.45	18.33	9.48
Брэст —	8.42	18.37	9.55

Месяц

Апошняя квадра 14 лютага. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *ГРАМНІЦЫ (Стрэчанне Гасподняе).*

К. *Агаты, Геаргіны, Арнольда, Зігфрыда, Юзафа.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Віншуем **Ніну Паўлаўну ЮНЕВІЧ** з 70-годдзем!

Пусть меняются зимы и вёсны,
Дней летит череда,
Только ты для нас остаешься
Самой лучшей на свете всегда!
Наша добрая-добрая мама,
Мы желаем с огромной любовью,
Жизни светлой, здоровья, тепла.

Дачка Таццяна з сям'ёй, сын Уладзімір з сям'ёй.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 13



Белыя: Крe1, Кh6, пп. a6, b5, d2 (5).
Чорныя: Крh8, Лb6, Сg7 (3).
Выйгрыш.

Заданне № 14



Белыя: Крf3, Кh2, п. e6 (3).
Чорныя: Крc4, пп. c3, g3 (3).
Выйгрыш.

Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЁ АДКАЗЫ

Змяшчаем рашэнні задач масавага конкурсу, апублікаваных 4.01 г.г.

Заданне № 9 (4 ачкі). Г. Хіскот (1914 г.).

Белыя: Крb8, Фf7, Сd3, Кd8, Кg8, пп. e3, f3 (7).
Чорныя: Крe5, Фh1, Лg2, Лh7, Сa8, Кd5, Кg7, пп. b3, c5, c6, h2, h6 (12).

Мат за 4 хады.

1. Сc4!~2. Фf6+ K:f6 3. Кf7+ Крf5 4. Кe7x, 1... Лg6 2. Фf4+ K:f4 3. Кf7+ Крf5 4. e4x, 1... Крd6 2. Фe7+ K:e7 3. Кf7+ Крd7 4. Кf6x, 1... Лh8 2. Фe6+ K:e6 3. Кf7+ Крf5 4. Сd3x. Самы цяжкі варыянт.

Заданне № 10 (2 ачкі). Ч. Гільберг (1877 г.).

Белыя: Крg5, Фa6, Лe1, Лh6, Сa2, Сc5, Кe6 (7).
Чорныя: Крe5, Фe4, Лd5, Кe8, п. g6 (5).

Мат за 2 хады.

1. Фf1! — цугцванг. Самы прыгожы варыянт — 1... Кр:e6+ 2. Фf5x.

ПРЫЗВАННЕ

Споўнілася 75 гадоў вядомаму беларускаму майстру шахматнага эцюда. Крыху аб ім самім. Яўген Іванавіч Дзвізаў нарадзіўся ў 1937 годзе ў Гомелі. Педагог, трэнер па плаванні, водным пола. Эцюдная кампазіцыяй захапляецца з 1964 года. Ім апублікавана больш 150 эцюдаў (75 у сааўтарстве з Г. Афанасьевым) у СССР, Беларусі, многіх краінах свету. Тройчы чэмпіён Беларусі па шахматнай кампазіцыі ў раздзеле эцюдаў. У складзе зборнай каманды Беларусі паспяхова выступаў у камандных чэмпіянатах СССР: 1968—69 гг. — 1 месца, 1970—71 гг. — 1 месца, 1981—82 гг. — 2—3 месцы, 1989—92 гг. — 2—3 месцы. У матчы зборных каманд СССР супраць зборнай Свету (1989—91) па складанні эцюдаў у лік лепшых 30 залікових увайшоў эцюд Я. Дзвізава. Сааўтар першай у Беларусі кнігі па шахматнай кампазіцыі «Шахматная композиция в Белоруссии». Аўтар шэрагу артыкулаў па эцюднай кампазіцыі. Супрацоўнічаў у падрыхтоўцы інфармацыі, матэрыялаў для энцыклапедыі «E1 arte del estudie de ajedrez» (Мастацтва шахматнага эцюда).

Многія яго эцюды адзначаны ў міжнародных конкурсах: прызамі — 19 эцюдаў, ганаровымі водгукамі — 21, пахвальнымі водгукамі — 10. Многія эцюды ўвайшлі ў кнігі і зборнікі лепшых кампазіцый свету.

Імяніннік сустракае свой юбілей поўным сіл і творчых задум. Пажадаем Яўгену Іванавічу моцнага здароўя і новых творчых поспехаў.

Прапануем рашыць самастойна адзін з арыгінальных эцюдаў аўтара.

Я. Дзвізаў (Жлобін)



Нічыя. 7+10

Урокі псіхалогіі

СЕСЦІ ЗА РУЛЬ... НЕ ГАТОВЫ!

Чым больш спакойны вадзіцель, тым ніжэйшая верагоднасць аварый і небяспечных сітуацый на дарогах. Гэта вядома. Паспрабуйце разабрацца ў сваім псіхалагічным настроі з дапамогай спецыяльнага тэста на ўпэўненасць у сабе і псіхалагічную гатоўнасць да самастойнага ваджэння аўтамабіля.

Адкажыце на кожнае пытанне «так» або «не» (адказ, які першым прыйшоў у галаву, хутчэй за ўсё і будзе аб'ектыўным).

1. Ці часта вы адчуваеце раптоўную стомленасць, хоць па сутнасці не ператаміліся?
2. Ці бывае, што вы раптам перажываеце няўпэўненасць — ці замкнулі за сабой дзверы?
3. Ці часта вы засмучаецеся без пэўнай прычыны?
4. Вы абыякава ставіцеся да таго, што машына, у якой вы едзеце, рухаецца ў сярэдзіне патоку?
5. Ці цяжка вам настроіцца на нечаканы візіт?
6. Ці палохаецеся вы часам, калі звоніць тэлефон?
7. Ці часта вам сняцца сны?
8. Ці хутка вы прымаеце рашэнні?
9. Ці непрыемна вам, калі вы знаходзіце на адзенні пляму і ў такім выглядзе трэба некуды ісці?
10. Ці любіце вы заводзіць новыя знаёмствы?
11. Ці бывае з вамі, што перад паездкай на адпачынак вам раптам хочацца адмовіцца ад яе?
12. Ці прачынаецеся вы з адчуваннем моцнага голаду?
13. Ці хочацца вам часам застацца сам-насам з сабой?
14. Калі вы прыйшлі ў кавярню адзін (адна), ці сядзеце за столік, дзе ўжо сядзяць наведнікі, калі ёсць свабодны стол?
15. Ці кіруецеся вы ў сваіх учынках галоўным чынам тым, чаго чакаюць ад вас іншыя?

За адказ «так» на пытанні 1, 2, 3, 4, 5, 6, 11, 12 і 15 — па адным бале.

За адказы «не» на пытанні 7, 8, 9, 10, 13, 14 — таксама па адным бале.

0 балаў
Вы настолькі самаўпэўнены, што, хутчэй за ўсё, проста нябачыра адказвалі на пытанні.

1-4 балы
Вы не ўчыніце неабдуманых дзеянняў на дарозе, а некаторая доля няўпэўненасці апраўдваецца адсутнасцю вопыту ваджэння і з'яўляецца доказам гібкасці псіхікі.

5-8 балаў
У вас добрае пачуццё ўпэўненасці ў сваіх сілах. Псіхалагічна вы гатовыя да самастойнага ваджэння, але не забывайце, што ў вас не так многа вопыту.

9-12 балаў
Ваша ўпэўненасць у сабе настолькі моцная, што вам пагражае небяспека не ўбачыць на дарозе тое, што заслугоўвае ўвагі. Бачыць толькі тое, што вы жадаеце, — не надта ўдалая стратэгія бяспечнай язды.

13-15 балаў
Ваш страх перад непрадбачанымі сітуацыямі настолькі вялікі, што нават пасля таго, як вы даехалі да патрэбнага месца, вы можаце працягваць перажываць сумненні і апаску з прычыны таго, што адбылося. Самае нязначнае змяненне абставін можа разбурыць ваша пачуццё ўпэўненасці ў сабе. У вас закладзена пэўная доля няўпэўненасці ў сабе. Але не адмаўляйцеся з-за гэтага ад развіцця ўласнай асобы, гэта не так дрэнна, як можа падацца спачатку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Аксана БЯЛАН:

— Калі вы набралі 13 і болей балаў, вам трэба падумаць аб тым, каб аднавіць унутраны спакой і вярнуць упэўненасць у сабе. Заняткі са спецыялістам-псіхатэрапеўтам з'яўляюцца ў гэтым выпадку аптымальным варыянтам, паколькі дазволяць за кароткі тэрмін разабрацца ў сабе, усвядоміць прычыны няпэўнасці і неспакою, а таксама распрацаваць эфектыўную праграму па рабоце над сабой. Разам са спакоем вы набудзеце магчымасць прымаць абдуманыя і правільныя рашэнні, што вельмі важна для таго, хто садзіцца за руль.

Кожны вадзіцель разумее, што для кіравання аўтамабілем, кантролю бяспекі дарожнага руху на першы план выходзіць увага. Чым цяжэй задача, якая ўзнікае перад намі, тым больш напружанай, інтэнсіўнай і глыбокай павінна быць увага. Хуткасць рэагавання непасрэдна залежыць ад таго, наколькі засяроджана ўвага вадзіцеля. Але тут важна не перабраць. Ёсць вадзіцелі, якія ажно прыціскаюцца лбом да шкла, кладуцца грудной кляткай на руль, напружваюць спіну... У выніку чалавек наадварот, спрыяе зніжэнню ўвагі.

Адцягваць жа ўвагу могуць не толькі размова па сотавым тэлефоне, праслухоўванне радыё, размова са спадарожнікам і г.д., але і нашы моцныя ўнутраныя перажыванні. Калі мы паглыбляемся ў сябе, навакольнае проста выпадае з поля зроку. Атрымліваецца, што чалавеку ў стане стрэсу, разваг, страху, гневу, крыўды, таму, хто спазняецца, злуецца і г.д. нельга садзіцца за руль. Але наўрад ці гэта магчыма. Што ж рабіць? Вучыцца кіраваць адмоўнымі эмоцыямі! Самы просты спосаб — ставіць перад сабой актуальныя псіхалагічныя мэты, унушаць сабе: «Я зараз магу адкінуць усё, што мяне трывожыць, мая ўвага засяроджана на дарозе», «Я спакойны, я спраўлюся з любой сітуацыяй». Важна, каб гэтыя ўстаноўкі былі станоўчымі і без часціцы «не»: «Я ўдала дабяруся да месца прызначэння» замест «Я не траплю ў аварыю».

Нямецкія даследчыкі сцвярджаюць, што пасля 7-8 гадоў вадзіцельскага стажу не адбываецца павышэння вадзіцельскіх здольнасцяў. Паводле расійскіх даследаванняў, такая мяжа наступае праз 5-6 гадоў.

Яшчэ адна немалаважная вартасць увагі — рассеянасць, няздольнасць засяродзіцца на кіраванні аўтамабілем працяглы час. Сапраўднай рассеянасці спрыяе наша стомленасць, колькасць уражанняў і няведанне мясцовасці.

Істотны ўплыў на стыль ваджэння і нашу навучальнасць аказвае тое, з кім мы як вадзіцелі асацыюем сябе — з «чайнікам» або асам, «маланкай». У жыцці мы нярэдка капіруем стыль паводзін іншых людзей. Так і калі мы садзімся за руль: мы выбіраем стыль язды, які ўласцівы некаму з важных для нас людзей або дзейнічаем у межах свайго ўласнага стэрэатыпу.

Для таго, каб дэталізаваць працэс набыцця майстэрства, неабходна ведаць пра яго чатыры ўмоўныя этапы.

1 этап. Пераадоленне пачуцця пастаяннай прысутнасці небяспекі.

Вадзіцель-пачатковец пастаянна знаходзіцца ў стане павышанай увагі, калі патрабуецца свядома кантраляваць шэраг аперацый, і гэта вельмі стамляе. У самым пачатку вадзіцель імкнецца пазбягаць складаных сітуацый, цяжкіх маршрутаў, трымаецца мінімальнага хуткаснага рэжыму. Лічыцца, што гэта прыводзіць да пераацэнкі бяспекі.

2 этап. Пачуццё небяспекі прыніжанае ў параўнанні з рэальнасцю.

Вынік ухілення ад крытычных сітуацый, сустрэч з грубымі формамі дарожных паводзін, ДТЗ можа быць падманна прыняты за ўласнае вадзіцельскае ўменне. Таму такі вадзіцель вядзе аўтамабіль у больш рызыкоўнай манеры. Гэты этап лічыцца найбольш небяспечным і можа працягвацца да 4 тыс. км прабегу. Часцей за ўсё на гэтым этапе сустракаюцца такія памылкі, як зразанне крывых, рух у левым радзе пры наяўнасці свабоднага правага, рух па сустрэчнай паласе, перавышэнне хуткасці, страта з поля зроку дарожных знакаў, недаацэнка сітуацыі і ў выніку гэтага ДТЗ. На фоне ж стрэсу можа нават знікнуць жаданне ездзіць. Пакуль навыкі за рулём яшчэ не ўстойлівыя, мэтазгодна звярнуцца па дапамогу да псіхатэрапеўтаў, псіхолагаў, напрыклад, нашага цэнтра, які знаходзіцца па вуліцы Мендзялеева, 4 (тэлефон рэгістратуры: 245 61 74). Спецыялісты дапамогуць ацаніць узровень стрэсу і трывогі, дадуць парады па нармалізацыі спакою, пры неабходнасці правядуць заняткі па рэлаксацыі. Гэтыя тэхнікі дазваляюць паслядоўна расслабіць усе групы мышцаў цела, што абавязкова пацягне за сабой і псіхалагічнае расслабленне.

Амерыканскія псіхолагі заўважылі, што прафесійныя аўтагоншчыкі ў звычайных умовах дарожнага руху мелі больш ДТЗ і дарожных правапарушэнняў, чым астатнія вадзіцелі. Гэта гаворыць пра тое, што на бяспеку руху ўплывае не толькі вопыт ваджэння, але і псіхалогія самога вадзіцеля.

3 этап. Аб'ектыўная ацэнка бяспекі. Адпавядае прыкладна ад 4 да 100 тыс. км прабегу. З'яўляюцца навыкі, набытыя ў выніку вопыту ваджэння, што дапамагае не забываць пра небяспеку на дарозе.

4 этап. Зніжэнне пачуцця бяспекі. Адпавядае 100 тыс. км прабегу, перыяду 3-4 гадоў ваджэння. Гэты феномен псіхолагі тлумачаць тым, што высокі ўзровень прафесіяналізму здольны прывесці да страты асцярожнасці.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л.ЛАХМАНЕНКА, Т.ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 719. Нумар падпісаны ў 19.30 14 лютага 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12